УДК 913

ГІДРАНІМІЯ МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ: ЭТЫМАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК (А – К)

І.М. Шаруха, МДУ імя А.А. Куляшова, г. Магілёў, Беларусь

Часопіс пачынае друкаваць часткі этымалагічнага слоўніка гідронімаў Магілёўскай вобласці. Ён складзены на аснове базы даных выдання «Блакітная кніга Беларусі» (1994) і «Геаграфічна-статыстычны слоўнік Магілёўскай вобласці» у 3 тт. (2012–2013). Рэдакцыйная рада мяркуе, што пасля абмеркавання, карэктыроўкі, дапаўнення матэрыялаў, слоўнік можа быць надрукаваны як асобнае выданне.

АДАМЕНКА, рака ў Быхаўскім раёне, правы прыток р. Дняпро. А- прэфікс, корань ДАМ- (ДМ-) – 'ціхае балота', фармант -ЕНКА (паказвае на незначную даўжыню ракі) або -ЯНКА (фіна-вугорскі, у сэнсе 'балота', вільготная катлавіна, лагчына). [40]. Патамонім адлюстроўвае та па графічныя асаблівасці. У той жа час у паўднёвых славян АДА- 'рачны востраў', 'востраў'.

АЗЁРЫ, ручай у Бабруйскім раёне, левы прыток р. Вір. Ручай злучае старык р. Бярэзіны і яе рукаў – Вір. Этымалогія гідроніма празрыстая.

АКЦЯБРСКІ КАНАЛ, канал у Клічаўскім раёне. Гідронім ад назвы в. Акцябрск Клічаўскага раёна.

АЛА, рака ў Кіраўскім, Бабруйскім, Жлобінскім, Светлагорскім раёнах, левы прыток р. Бярэзіна. ALA – з фінскай мовы 'ніжняе, нізіннае'. Індаеўрапейскі корань OL [17] азначае 'мокрае, затарфаванае месца'. Можна патлумачыць патамонім як 'рака, што цячэ ўніз' (з

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

поўначы на поўдзень – важная характарыстыка для руху па рэках), ‘балотная рака’.

АЛЕШНЯ, рака ў Касцюковіцкім раёне, правы прыток р. Беседзь. 1) У значэннях ‘балота з дробным хмызняком’, ‘балота з зараснікамі альхі’, польскае OLS- ‘забалочаны лес’, фінскае ALHO- ‘балота, нізіна’ [37], ALA – з фінскай мовы ‘ніжняе, нізменнае’, індаеўрапейскі корань OL – ‘мокрае, затарфаванае месца’. Фармант -Я –‘рака’.

АЛЬНІЦА, рака ў Глускім раёне, левы прыток р. Даколька. ALA – з фінскай мовы «ніжняе, нізіннае»; -ІЦА – ‘рака’. Індаеўрапейскі корань OL (Э. Мурзаеў) азначае ‘мокрае, затарфаванае месца’.

АЛЬХОЎКА, рака ў Магілёўскім раёне, левы прыток р. Жыварэзка. АЛЬХОЎКА, рака ў Мсціслаўскім раёне, правы прыток р. Белая Натапа. АЛЬХОЎКА (ЧАРНАВОДКА ВАБІЧ, ЛЕВЫ ВАБІЧ), рака ў Шклоўскім раёне, левы прыток р. Вабіч. Магчыма фітагідронімы – ад назвы пароды дрэвы, але найбольш верагодна, што гелонімы: ALA – з фінскай мовы ‘ніжняе, нізіннае’ (індаеўрапейскі корань OL- – ‘мокрае, затарфаванае месца’), фінскае ALHO- ‘балота, нізіна’, ‘балота з дробным хмызняком’, ‘балота з зараснікамі альхі’, польскае OLS- ‘забалочаны лес’ [37]. Беларускі геаграфічны тэрмін АЛЁС – ‘нізкае забалочанае месца’.

АЛЬШАНКА, рака ў Касцюковіцкім раёне, левы прыток р. Крупянка. АЛЬШОЎКА, рака Хоцімскага раёна, левы прыток р. Беседзь. Магчыма фітагідронімы – ад назвы пароды дрэвы, але найбольш верагодна, што гелонімы: ALA – з фінскай мовы ‘ніжняе, нізіннае’ (індаеўрапейскі корань OL- – ‘мокрае, затарфаванае месца’), фінскае ALHO- ‘балота, нізіна’, ‘балота з дробным хмызняком’, ‘балота з зараснікамі альхі’, польскае OLS- ‘забалочаны лес’ [37]. Беларускі геаграфічны тэрмінам АЛЁС – ‘нізкае забалочанае месца’.

АНТОПАЛЬСКІ (ЛОЧЫНСКІ) канал у Чэрвеньскім і Асіповіцкім раёнах, левы прыток р. Балачанка. Назва другасная, утворана ад назваў Лочынскага возера, з якога выцякае (каля в. Лочын Асіповіцкага раёна) і в. Антопаль.

АРЛЯНКА, рака ў Магілёўскім раёне, левы прыток р. Друць. Народная семантыка тлумачыць паходжанне назваў ад назвы птушкі АРОЛ. Гідронімы ўтвораны ад балцкага тэрміна ў значэнні ‘возера’ (вядомы і старажытнарускі тэрмін ОРЛЕ– ‘возера’). Не выключаецца фінамоўны ўплыў на ўтварэнне назваў: АР-/ОР-, АРА-/ОРА- карэльскае, фінскае – ‘даліна’; ЯНК- – ‘балота’, ‘вільготная катлавіна, лагчына’ [37].

АРЦІСЛАЎКА, рака ў Шклоўскім раёне, левы прыток р. Дняпро. Назва гідранімічная – прэфікс А- у значэнні ‘рака’ + -РЦ-/-РД- (‘возера, выток з возера’) + -СЛ- (‘вада’, ‘струмень’) і дэмінутыўны фармант -АЎКА. Элемент СЛ- этымалагічна звязаны з фінскім SALMI – ‘праліў’, прускім SALUS – ‘дажджавы ручай’, смаленскім дыялектным САЛІК – ‘ручай’, латышскім ŠLAKSTET ‘плёскаць’, старажытнарускім СЛЪПАТИ – ‘цекчы, хвалявацца, віраваць’. [1, с. 107]. Назва ў значэнні ‘рака з вытокам з возера, азёрная рака’.

АРЫЯ (БРУСЬКАЯ), ручай у Быхаўскім раёне, левы прыток р. Варонінка. У значэнні ‘балотная пратока, рака з возера, забалочанага возера’. Варыянтная назва ў такім жа значэнні.

АРЭХАЎКА, вадасховішча ў Клічаўскім раёне. Гідронім паходзіць ад назвы вёскі.

АСІПОВІЦКАЕ вадасховішча (з 1953 г.), у Асіповіцкім раёне, на р. Свіслач. Этымалогія зразумелая – назва ад г. Асіповічы.

АСЛІК (АСЛІЎКА, ОСЛІК), рака ў Круглянскім і Бялыніцкім раёнах, правы прыток р. Друць. Корань СЛ-. Больш старажытная назва (П.П. Сямёнаў-Цян-Шанскі) – СЕЛІЎКА. Корань СЕЛ-/СЛ- саамскае СОЛ- – ‘возера’, фінскі SALMI – ‘праліў’, прускі SALUS – ‘дажджавы ручай’, смаленскі дыялектны САЛІК – ‘ручай’, фіна-вугорскі СЕЛ/СЕС- ‘ручай, лясны ручай, ручай у лесе на балоце, маленькая рэчка’ (кецкае СЕС – ‘рака’). Назва ў значэнні ‘лясная забалочаная рака з вытокам з возера, забалочанага возера, балота’.

АСЦЁР (АСТРА), рака ў Смаленскай вобласці Расіі, Клімавіцкім, Крычаўскім раёнах, левы прыток р. Сож. Корань СТР- дастаткова распаўсюджаны ў гідраніміі. Выдомы шматлікія версіі паходжання: 1) Ханаанская версія, у значэнні ‘праломная рака’ [30]. 2) ад старажытнаславянскага ОСТРЪ – ‘войстры, гарачы, круты, бугрысты, нароўны’, з параўнаннем Месяца, які так жа мае характарыстыкі ‘серпападобны’, ‘войстры’; рака-прысвячэнне Месяцу, бо цячэ на захад. 3) Лацінская версія – ад OSTENDO, OSTENTUS, OSTENTO (OS) – р. Асцёр прысвечана Пуцяводнай зорцы. 3) В. Пятроў (1972) СТР- ‘паток, струмень, востраў, хуткі’, СТРУМОК ад старажытнаіндыйскага SRAVATI – ‘цячэ’ [21, с. 86]. У Іпацеўскім летапісу пад 988 г. Асцёр называецца як р. Оустрь (УСТРЬ). 4) Хазарская версія – у 1659 г. вядома ўкраінская р. ОСТРЕДЬ. Хазары-іўдзеі тут жылі раней, чым была ўтворана Кіеўская Русь; на іўрыце: О+СТЕР, ВЪ+СТР, ОУ+СТРЬ, У+СТРЬ, О+СТРЬ. Аснова *СИТЕР חָתַם –‘хаваць’, ‘знікаць’; СЕТЭР חָתַם ‘патайное месца’, ‘укрыццё’ (у грэчаскай СОТЕР- –‘збавіцель’, у грэчаскай і рымскай міфалогіі імёны Багоў; у хрысціянстве Соцер-Збавіцель – Ісус). Усё гэта добра, але не тлумачыць назву ракі. Латышскі апелятыў STRAUTS – ‘ручай’, нямецкі і шведскі STROM – ‘цячэнне, струмень, рака’, нават, беларускія геаграфічныя тэрміны СТРУМЕНЬ, СТРУГ, рускі СТРУЯ, старажытнагрэчаская назва ніжняга цячэння Дуная – ІСТР. Канструкцыя патамоніма: два кораня АС- і ЦЁР-/ТР-; назва ў значэнні ‘ рака, якая выцекае з возера’.

АЎСІМАВІЦКІ (ВАРАТЫНСКІ КАНАЛ) канал у Бабруйскім раёне. Этымалогія зразумелая – назва ад в. Аўсімавічы (в. Варатынь).

АЎЧОСА, рака ў Шклоўскім раёне, басейна р. Дняпро. Гідронім блізкі да назваў Цёса, Цёста – у значэнні ‘вада, рака’ [1, с. 59]. Блізка семантычна да кораня ЧУС-/ЧОС- – ‘бойкая рака’.

БАБОЎЕ (ПАКРОЎКА), канал у Бабруйскім раёне. Этымалогія зразумелая – назва ад вв. Бабоўе, Пакроўка.

БАБРОЎКА, возера ў Слаўгарадскім і Быхаўскім раёнах. БАБРУЙКА, рака ў Бабруйскім раёне (ад яе назва г. Бабруйск). 1)

Электронный архив Библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гідронімы зоанімічнага паходжання, ад жывёлы бобр, у некаторых выпадках і ад вавёркі, параўнаць: бобр/бабёр/вавёр і вавёрка. 2) Гідронімы фітанімічнага паходжання, ад лясоў, лясной культуры [24, с. 281]. 3) Этнанімічнага паходжання ад обраў, авараў, напрыклад, р. Бобр, на ханаанскай мове – рака 'якая перасякае землі обраў/авараў' [30, с. 192]

БАГДАНАЎСКІ канал у Кіраўскім раёне. Этымалогія зразумелая – назва ад былой в. Багданаўка.

БАЛОНАЎКА, рака ў Быхаўскім раёне, басейна р. Дняпро, на ёй в. Балонаўка. Літоўская аснова BAL-, BALAS- –'балота', 'нізіна'. БАЛОНЬ-АБАЛОНЬ – 'заліўныя прырэчныя сенажаці' [43, с. 84].

БАРБАРОЎСКІ (МАЛІНАЎСКІ) канал у Глускім раёне, правы прыток р. Даколька. Этымалогія зразумелая – назва ад вв. Барбарова і Малінаўка.

БАРОЎКА, рака ў Чэрыкаўскім і Клімавіцкім раёнах, левы прыток р. Лабжанка. БАР- – 'балота', БАР-/ВОР - –'возера'. У славянскіх мовах БАРА – 'лужа', 'луг', 'балота' (славенская), BARINA (чэшская), BARZINA (польская) – 'балота'; у фіна-вугорскай гідраніміі БЛ-/БАЛ – 'возера', 'балотнае возера'. Магчыма сувязь з асновай у значэнні 'лес, бор'.

БАРЫСФЕН, назва р. Дняпро ў старажытнасці. 1) 'рака з Поўначы' (Герадот). 2) БАР- / БОР- – 'балота' (выток з балота). 3) БАР-/ВАР- ад фіна-вугорскай формы Вар-Йокі – 'лясная рака'. 4) БАР-/БОР-/ВАР-/ВОР- – 'забора', БОРСІ / ВОРСІ / ФОРС – 'парожыстая' [8, с. 26–27].

БАСЯ, рака ў Дубровенскім, Шклоўскім, Горацкім, Дрыбінскім, Чавускім раёнах, правы прыток р. Проня. 1) Цюркская назва 'галоўны, вялікі прыток Проні' [3, с. 212], але гэта малаверагодна. 2) Ад жаночага імя Бася, якое распаўсюджана ў суседняй Польшчы; Ба-са – 'бабья ноч' [24, с. 281], малаверагодна. 3) Вялікі Гістарычны Атлас падае назву як старажытнаіранскую, бо магчыма сувязь са скіфскім БАСАЧ –' вялікая' [10, с. 528]. 4) У адпаведнасці з версіяй У. Топарава (1974), назва балцкага паходжання – ад *BAS-, ад латышскіх BASI, BASITES, старажытнапрускага BOSIN [31, с. 256]. Лічым, што аснова БАС- звязана са старажытнай асновай у значэнні 'вада, рака', напрыклад, БА(Б)-/ВА(Д)- фіна-вугорская аснова ў значэнні 'лясное возера'. С(А)- – фіна-вугорскае 'возера', альбо 'балота' (ША-/СА-; фінскае SUO – 'балота'), Я- 'рака'. Назва ў значэнні 'рака, што цячэ праз балоты, з вытокам з возера, балота' [37]. На комі мове ВАСӦД СЕН –' вільготная лагчына'.

БАХАНСКІ канал у Быхаўскім і Слаўгарадскім раёнах. Этымалогія зразумелая – назва ад в. Бахань Слаўгарадскага раёна.

БАЯНАВІЦКІ канал у Глускім раёне, правы прыток р. Даколька. Этымалогія зразумелая – назва ад в. Баянава.

БЕЖЫЦА, рака ў Глускім раёне, левы прыток р. Пціч. Мае значэнне 'вада, якая цячэ праз балоты' (БЕЖ- можа быць звязаны са славянскім значэннем 'глыбокая яма, лужа').

БЕЛАЯ НАТАПА, рака ў Мсціслаўскім раёне, басейна р. Сож. Ад геланімічнай асновы БЕЛЬ – 'махавое балота' (BAL-, BALAS- –'балота'), ПЕЛЬ – 'балота'. Натапа – 'дрыгва, балота', 'вір'.

БЕЛАЯ, рака ў Кіраўскім раёне, правы прыток р. Друць. Назвы ад геланімічнай асновы БЕЛЬ – 'махавое балота' (BAL-, BALAS- –'балота'), ПЕЛЬ – 'балота'.

БЕЛІЦА, рака ў Бабруйскім раёне, правы прыток р. Ала. БЕЛЫ БЕРАГ, возера ў Бабруйскім раёне, у пойме р. Бярэзіна. Геланімічная аснова БЕЛЬ – 'махавое балота' (BAL-, BALAS- –'балота'), ПЕЛЬ – 'балота', канчатак –ІЦА, паказвае на вадаток.

БЕСЕДЗЬ, рака ў Смаленскай вобласці Расіі, у Хоцімскім, Касцюковіцкім раёнах, Бранскай вобласці Расіі, Веткаўскім раёне. Версіі назвы: 1) У значэнні СКАМЬЯ [11, с. 12]. 2) Ад слова БЕСЕДА [7, с. 27]. 3) Версія А. Рогалева ад ОБ- 'вада' і СТА- – іранскі апелятыў 'стаянка, стан, месца вобласці' [26, с. 138, 139]. 4) Балцкая версія У. Топарава і А. Трубачова – ад літоўскіх BESTINIS, BEST-UPIS, латышскага BESTE [32, с. 177], ад літоўскага BESTI – 'капаць' [5, с. 63]. 5) Этнанімічнага паходжання ад ВЕСІ. Лічым, што ў канструкцыі назвы корані БА-/БЕ-/БІ- /БЕС- – 'вада, рака, балота' і –СЕТ- – фіна-вугорскі 'ручай, лясны ручай, ручай у лесе на балоце, маленькая рэчка'.

БЛАГАЎКА, рака ў Хоцімскім раёне, правы прыток р. Беседзь. Звязваць патамонім са значэннем 'благі' (благой, хороший – у рускай і дрэнны ў беларускай мове) нельга. Корань БЛ- паказвае на сувязь з забалочанымі мясцінамі, -Г- – 'рухомая вада', фармант -АЎКА- паказвае, што вадаток невялікі.

БОТЧА (КЕЧКАЎКА), рака ў Асіповіцкім раёне, левы прыток р. Свіслач (басейна р. Дняпра). Аснова – БОЧ. У фіна-вугорскай мове геаграфічны тэрмін БОТНА азначае 'ніз, нізкае месца', напрыклад, Батнічны заліў, у архангельскіх землях – БОТЧА / ПОТЧА – 'азёрны заліў, затока, губа'; славянскія – БОЧА, БОЧАГ, БАЧЭЙКА – 'яма на дне ракі, возера, балота, вір'; назвы Ботча / Бытча часта звязаны з крынічнымі месцамі.

БРОЖА (ПРОДЗВІНКА, БРОЖКА), рака ў Бабруйскім раёне, правы прыток р. Бярэзіна. Аснова БР- – 'балота'. У назве Продзвінка – балцкая аснова ДВ-/ДЗВ-, якая магла трансфармавацца з фіна-вугорскай СВ-, адпавядае паняццю 'вада (якая рухаецца)', 'рака', 'балотная рака'.

БРУСЬКАЯ (АРЫЯ), рака ў Быхаўскім раёне, левы прыток р. Варонінка (ВАР- – 'балота', 'узвышанае лясное месца сярод балота, нізіны'). У дадзенай групе патамонімаў корань БР- магчыма паходзіць ад БРУЙ, БРУЯ – 'бруісты' ('імклівы') [43, с. 108] і -УСА- – 'возера'. БРУС, БРУДАСЬ – яшчэ і ў значэннях 'брод', 'мелкаводдзе'. Назвы ў значэнні 'рака з хуткім цячэннем паміж балот, з вытокам з возера, забалочанага возера'.

БУДАГОШЧ, возера ў Мсціслаўскім раёне, басейна р. Віхра, каля в. Будагошч. БУД- звязаны з коранем VESI 'вада, рака', вепскі, фінскі PUDAS – 'пратока, рукаў ракі', саамскі –'вузкі, глыбокі рачны заліў'. На паўночным-захадзе Расіі, на Беларусі, у Польшчы немала населе-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ных пунктаў з асновай ГОШЧ (існуюць версіі ад балцкага ГОШЧ- 'хата'). ГОШЧ хутчэй звязана з забалочанымі, дрыгвяністамі мясцінамі, і выкарыстоўваецца ў значэнні 'гаць'.

БУДЛЯНКА, рака ў Магілёўскім, Чавускім, Быхаўскім раёнах, правы прыток р. Раста. БУД- – 'вада, рака', 'пратока, рукаў ракі', 'вузкі, глыбокі рачны заліў', -Л- 'возера', -ЯНКА дэмінутыўны канчатак (можа быць звязаны з – ЯНК – 'балота', вільготная катлавіна, лагчына, 'вялікае балота', 'махавое дрыгвяністае балота').

БУДНЕЎСКІ канал у Клічаўскім раёне. Этымалогія зразумелая – назва ад в. Буднева.

БУДЧЫНСКІ канал у Бабруйскім і Жлобінскім раёнах. Гідронім паходзіць ад назвы в. Будчын.

БЫКАЎКА, ручай у Чавускім раёне, левы прыток р. Вілейка. БЫ- – 'вада, рака, ручай', -КВ-/-ХВ- (ХОЙ- 'балота'); БЫК – 'камень у вадзе, мыс пры сутоку двух рэк' [17, с. 106].

БЫСТРАНКА, рака ў Дрыбінскім раёне, левы прыток р. Проня. БЫСТРАЯ, рака ў Горацкім і Дрыбінскім раёнах, левы прыток р. Проня. БЫСТРЫ ручай у Горацкім раёне, правы прыток р. Дняпрэц. Назвы-характарыстыкі струмення. БЫ-/БА- 'вада', -СТР- 'струмень' – 'струмень сярод балот, балотная вада, балотная рака'.

БЯЗВУСЦЯ, рака ў Клімавіцкім раёне, левы прыток р. Асцёр. Назва ад таго, што раней вусце было невыразным, рака ўпадала некалькімі рукавамі ў старыкі р. Асцёр.

БЯЗДОННАЕ, назвы каля 30 невялікіх па плошчы азёр. Назва-характарыстыкі глыбін, 'возера без дна'. Але трэба нагадаць, што латышскае DUNAS – 'іл, гразь'.

БЕЗЫМЕННАЕ (ПАЛЫКАВІЦКАЕ), возера на мяжы Шклоўскага і Круглянскага раёнаў. Этымалогія зразумелая.

БЯЛЫНІЦКІ канал ў Бялыніцкім раёне. Гідронім паходзіць ад назвы г. Бялынічы.

БЯЛЯНКА, рака ў Крычаўскім раёне, правы прыток р. Сож. БЯЛ- – 'махавое балота'.

БЯРЛЯНКА, рака, другая назва р. Каўпіта. БЯРЛЯНКА, рака ў Краснапольскім раёне, правы прыток р. Каўпіта. Аснова БЯР-, суфікс -Л-, фармант –ЯНКА. БЯР- 'возера', альбо 'балота'; гідранімічны суфікс -Л-, фармант ЯНКА- –'рака', або 'невялікі вадаток'.

БЯРОЗАВАЕ (КУТЫ), возера ў Кіраўскім раёне, у пойме р. Бярэзіна. Геланімічная аснова БАР-/БЯР- – 'балота'. Не выключаем уплыў латышскай асновы BIRŽE – 'бярозавы гай'.

БЯРЭЗІНА (БЕРАЗІНА, БЕРАЗІНА ДНЯПРОЎСКАЯ, БЯРЭЗІНА ДНЯПРОЎСКАЯ), рака, у Докшыцкім, Лепельскім, Барысаўскім, Бярэзінскім, Клічаўскім, Асіповіцкім, Бабруйскім, Кіраўскім, Светлагорскім, Жлобінскім, Рэчыцкім раёнах, самая вялікая з рэк, якія маюць і выток і вусце на тэрыторыі краіны (613 км), у верхняй плыне цячэ праз азёры Медзазол і Палік. Назва ўвайшла як тапаном у французкую мову ў значэнні «параза» (пасля бітвы на Бярэзіне, 1812). Самыя папулярныя версіі паходжання назвы: ад славянскага апелятыва БЯРОЗА, ад літоўскага BERZAS – 'бяроза', латышскага BIRŽE – 'бярозавы гай'. Зразумела, што гідронімы названы не ў гонар пароды дрэва, якая займае другое месца пасля хвоі сярод лесаўтваральных парод у краіне, што б супярэчыла асноўнаму закону тапанімікі (аб'екты атрымліваюць свае назвы ад нейкіх адметнасцяў мясцовасці, цікавостак, выключных рысаў краявідаў). З XVI ст. выказваюцца меркаванні аб магчымай сувязі назвы Дняпроўскай Бярэзіны са старажытнагрэчаскай назвай р. Дняпро – БАРЫСФЕН. Спрэчкі ўзнікаюць галоўным чынам пра тое, які з гэтых двух патамонімаў першасны. Акадэмік Б. Рыбакоў упэўнены, што старажытная назва БАРЫСФЕН захавалася ў сучаснай назве Бярэзіна [22, с. 65]. Назву БАРЫСФЕН лічуць іранскай – 'шырокае месца', 'высокае месца' [33]; альбо ў БАРЫСФЕН – 'вялікая паўночная рака'. Неабходна прыгадаць і іншыя старажытныя назвы – БАР, ВАР, ВАРУХ – Бярэзіна і Дняпро ніжэй сутоку з Бярэзінай – 'вялікая вада'; некаторыя лічаць, што ад ВАРУХ пайшла і назва ВАРАГІ. М. Фасмер ставіў пад сумніў гэтую версію аб характарыстыках Барысфена, бо людзі ў старажытнасці не мелі дакладных звестак аб верхняй і сярэдняй плынях Дняпра. Ускосным доказам грэчаскай версіі можа служыць супадзенне з назвай вострава Беразань-Барысфеніда каля вусця р. Дняпро. Ю. Адкупшчыкаў [19], звязвае назву са старажытнагрэцкім Βορυσθένης, прапануе іншую этымалогію і звязвае назву ракі з балцка-славянскім коранем у значэнні 'хуткі' (літоўскае BURZDŪS, праславянскае *BЪRZЪ), 'борзы' [19, с. 336-352]. Вядомы гідранімічны элемент БЕР – у значэнні 'крыніца' [30, с. 182], 'выток', 'хуткае струменне' (інда-еўрапейскія BHER- 'праразаць', 'прабіваць'; Бярэзіна Дняпроўская праразае Беларускую граду – Рыпейскія горы Герадота; у вярхоўях сустракаюцца тапонімы тыпу Бытча) [38]. У гідраніміі такжа вядома старажытнаеўрапейская аснова БЕР-/БЯР- у значэнні 'балота' [39; 42]. Усе беларускія рэкі з назвай БЯРЭЗІНА знаходзяцца сярод леса-балотных краявідаў, таму можна меркаваць, што ў назвах прысутнічаюць геланімічныя асновы БАР-/БЯР-, хаця не выключаецца ўплыў латышскай асновы BIRŽE – 'бярозавы гай' (Вялікі Гістарычны Атлас падае назву як балцкую). Атрымліваем, што Бярэзіна – 'рака, якая цячэ з забалочанага возера, балота, з балотных крыніц, цячэ па водна-балотных мясцінах (з бярозавымі зарасцямі)'.

БЯСІТА (ЧАРНЯЎКА, ПЕРАСУХА), рака ў Быхаўскім раёне, правы прыток р. Гутлянка. Варыянтная назва адлюстроўвае колеравую характарыстыку, магчыма і сувязь з асновай ЧАР- – 'возера, забалочанае возера з ручаямі, рэкамі, пратокамі'. Геланімічнага значэння і назва Бясіта (БА- 'вада', СІТ- 'ручай, лясны ручай, ручай у лесе на балоце, маленькая рэчка').

ВАБІЧ (ЧАРНАВОДКА), рака ў Шклоўскім раёне, левы прыток р. Вабіч. ВАБІЧ (БАБІЧ), рака ў Круглянскім, Шклоўскім і Бялыніцкім раёнах, левы прыток р. Друці. Малаверагодна паходжанне ад тэрміна са значэннем 'прываб-ны, прыгожы' ад славянскага, на думку У. Топарава і А. Трубачова, VABITI (магло мець месца пераасэнсаванне), як і версія паходжання ад літоўскага паняцця VABALAS 'жук' [32, с. 178].

Электронная библиотека ИМЯ А.А. Кулешова

Тэрмін ВАБА ўжываецца ў сэнсе 'водны край', 'рачны край' (ВА- – частка тэрміна ВАДА, ВАД- у фіна-вугорскіх тэрмінах часта выступае ў значэнні 'лясное возера'). Патамонім складаецца, на думку А. Рогалева (1999) з двух кораневых кампанентаў: ВАБ- (фанетычны варыянт ад ОБ- са значэннямі 'вада', 'рака') і –ІЧ (зараз успрымаецца як фармант, а ў старажытнасці гідранімічны тэрмін са значэннямі 'вада', 'крыніца' [25]. Пагаджаемся з меркаваннем А. Рогалева, бо сапраўды, гідронім мае фінавугорскія асновы: ВА- (або В- прыстаўное, з гідранімічным зместам) – 'балота' (наша мясцовасць забалочаная) або 'рака' [36, с. 60-62], або БА- 'дрыгва'; ОБ- – 'вада, рака', 'балотная вада' (магчыма метатэза) і –ІЧ (-ІЦ). Некалькі асноў са значэннем 'вада', 'балотная вада', як бы падкрэсліваюць значэнне і галоўнай ракі і яе прытокаў у дрэнаванні тэрыторыі. Напэўна гэтыя акалічнасці аўтарамі гідроніма ўспрымаліся вельмі важкімі, што дазволіла славянам пераасэнсаваць старажытную назву і ўспрымаць яе як 'рачны край', 'прывабны, прыгожы'. З пункту гледжання старажытнага насельніцтва, верагодна, Вабіч – 'рака, якая цячэ па забалочанай мясцовасці і збірае воды рэк, якія цякуць з балот'. І. Яшкін прыводзіць беларускі геаграфічны тэрмін БАБА – 'дрыгва' [43, с. 75].

ВАДАНОСКА, рака ў Клічаўскім раёне, правы прыток р. Сушанка. Добра зразумелая назва – 'тая, што нясе ваду'. 'Рака, якая выносіць ваду з лясного возера або балота'(ВАД – 'лясное возера, балота').

ВАЛОЖЫНСКІ канал у Акцябрскім і Глускім раёнах. Этымалогія зразумелая – назва ад в. Валажода Акцябрскага раёна.

ВАРАТЫНСКІ (АЎСІМАВІЦКІ) канал у Бабруйскім раёне. Этымалогія зразумелая – назва ад в. Варатынь (в. Аўсімавічы).

ВАРВАРАЎКА, каналізаваны ручай у Хоцімскім раёне. Этымалогія зразумелая – ад назвы в. Варвараўка.

ВАРОНІНКА (ВАРОНІНА), рака ў Быхаўскім раёне, правы прыток р. Ухлясць. Корань ВАР- – 'балота', а магчыма і 'лес' (фінавугорскае ВОР-). Назва ў значэнні 'леса-балотная рака з вытокам з возера, балота'.

ВАСІЛЁЎКА, рака ў Шклоўскім і Бялыніцкім раёнах. Этымалогія празрыстая – ад назвы в. Малыя Васількі Бялыніцкага раёна. Першапачатковая назва патамоніма звязана з гідранімічнымі асновамі ВАС-/БАС-.

ВАСЬКАЎКА, ручай у Хоцімскім і Клімавіцкім раёнах, басейна р. Сож. Этымалогія празрыстая – ад назвы в. Васькаўка Клімавіцкага раёна. Першапачаткова ручай (рака) мог мець назву, якая этымалагічна звязана з гідронімам БАСЯ.

ВАЎЧАНКА, рака ў Асіповіцкім і Бабруйскім раёне, правы прыток р. Бярэзіна. Вялікая колькасць назваў для балот, лагчын, яроў, забалочаных азёр і г.д. Назвы, якія папярэджваюць: непраходнае балота, небяспечнае месца, ваўчыная ягада і інш. ВОЎ-/ ВОЛ- – 'вільгаць', корань звязаны з тапонімамі ў воднабалотных мясцінах. ВАЎ-/ВОЛ- 'паглыбленне', 'рака, паток, пратока', комі ВОЛ-/ОЛ- 'ручай, пратока', карэльскі тэрмін ВАЛУО – 'ліцца'.

ВЕЙНА (ЛУБЯНЫ), возера ў Бялыніцкім раёне, на балоце Вейна, басейна р. Дняпро. Другая назва Лубяны – ад в. Лубяны.

ВЕЛЕМЬЁЎСКІ канал у Быхаўскім раёне. Этымалогія празрыстая – ад назвы Велемьёва Балота.

ВЕПРЫНКА, рака ў Клічаўскім і Кіраўскім раёнах, басейна р. Друць, упадае ў Чыгірынскае вадасховішча. Мясцовае тлумачэнне патамоніма ад назвы дзікага кабана – вепра (лат. Sus scrofa), як 'дзікая рака'. Але ж назва гідранімічнага паходжання –корань -ПР-, як і ў назвах Непер, Непр, Днепр. У значэнні 'балоцістая рака, з вытокам з возера, балота'. ПЕРА – 'балоцістае месца' [17, с. 432], ПР- 'ручай', 'рака'.

ВЕРАБ'ЁЎКА, рака ў Горацкім раёне, левы прыток р. Паўна. Назва ў значэнні 'невялікая рака з вытокам з возера'. Лімнонім фінамоўны ў значэнні 'возера': фінскае JARVI, вепскае JARV, саамскае JAWRE. Канчатак -А- – уплыў славянскага апелятыва ВОЗЕРА. [1, с. 51–52]

ВЕРБАЎКА, рака ў Горацкім і Чавускім раёнах, левы прыток р. Проня. Этымалогія зразумелая.

ВЕСНАЎСКІ канал у Глускім раёне. Этымалогія зразумелая – назва ад в. Веснаў.

ВІДЛІНКА, рака ў Чавускім раёне, басейна р. Дняпро. Гідранімічная фіна-вугорская аснова ВІД- у значэнні 'лясное возера'. Рака цячэ па забалочанай мясцовасці (некалі азёрна-балоцістай), рэчышча каналізаванае.

ВІКТАРАЎСКІ (МЫШКАВІЦКІ) канал у Кіраўскім раёне. Этымалогія зразумелая – назва ад в. Віктараўка (аг. Мышкавічы).

ВІЛЕЙКА (ВІЛЛЕ), рака ў Чавускім раёне, левы прыток р. Раста. ВІЛЬЧАНКА (ВІЛЬЧА, ДЗЯГЦЯРКА), рака ў Магілёўскім раёне, левы прыток р. Дняпро. Існуюць шматлікія спробы і варыянты тлумачэння гідронімаў з асновай ВІЛ-: у значэнні 'заселеная людзьмі рака', ад кельцкага ВІЛЬ – 'пасяленне'; ад дзеяслова ВІЛЯЦЬ, ад ханаанскага ў значэнні 'шлях да Бога' [30, с. 184]; ад літоўскіх VĖLĖ 'душы памерлых', VELNIAS – 'чорт'; у значэннях 'Вялікая рака', 'Вялесава рака'; ад лацінскіх VIL-, VILIS – 'худы', VILLA – 'сяло', VILLUS – 'спляценне валос, каса'; ад тэрміна на германскіх мовах WHEEL (WI:L) – 'калясо, руль'; з польскага ВІЛК – 'воўк' [12, 2008]; ад этноніма вільцы. А. Ванагас спасылаецца на К. Буга, якія лічыць гідронімы літоўскімі. Напрыклад, у ніжняй плыні нёманская р. Вілія – NERIS, але аўтахтонным літоўскамоўным насельніцтвам верхняя плыня Віліі (Гервяты) называлася VEILIA (Вяйля). Гідронімы з коранем ВІЛ- ёсць і ў басейнах Дзясны (Украіна) і Прыпяці – іх польскі лінгвіст Ежы Налепа адносць так жа да балцкіх. Jan Otrębski выводзіць назву Вілія ад літоўскага VILNIS 'хваля'. Бясспрэчным з'яўляецца той факт, што корань ВІЛ-/ВЕЛ-/ВЯЛ- гідранімічны, у значэнні 'вада, рака', 'рака забалочаных мясцін'. Не выключаем сувязь з фінамоўнымі асновамі ВЕС-/ ВЕТ-, ВЕСІ- / ВЕЦІ-.

ВІР, рака ў Бабруйскім раёне, басейна р. Бярэзіна. Назвы ад ВІР – 'вір', 'быстрына' (ВЫР), 'нізкае месца', 'акно ў балоце', 'віраваць': возера, рака з вірамі; 'рака, якая

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

віруе' (у дачыненні, напрыклад, да р. Вір – рукава р. Бярэзіна) [17, с. 122; 15], сувязь з беларускім народным геаграфічным тэрмінам ВІР – 'глыб, вомут'. Малаверагоднымі з'яўляюцца версіі, але і іх трэба мець на ўвазе, паходжання ад фіна-вугорскіх асноў ВІРВ- – 'лес', VOR- – 'узвышша' [16, с. 157].

ВІТАВА, рака ў Хоцімскім раёне. ВІТ- –'вада' [36, с. 60-62], 'вільгаць', ВА– 'рака, вада' [34, с. 66].

ВІХРА (ВЕХРА), рака ў Смаленскай вобласці і Мсціслаўскім раёне, правы прыток р. Сож. 1) ад ВІХУР – шмат лук, меандраў, звілін. 2) На мове комі ВІС- – 'пратока', венгерскія ВІЗ-, ВІЗС-, ВІЗАР- – 'водны паток. 3) Беларускія народныя геаграфічныя тэрміны ВІХОР, ВІХРАВІНА – 'глыбокае месца на рацэ, вір' [43, с. 148].

ВІХУР, канал у Асіповіцкім раёне. Беларускі народны геаграфічны тэрмін ВІХОР – 'глыбокае месца на рацэ, вір' [43, с. 148].

ВІШАНКА, рака ў Касцюковіцкім раёне, правы прыток р. Сураў. ВІШНЕЎСКІ канал у Бабруйскім раёне. Аснова ВІШ- (ВІ- 'вада' + Ш- 'балота'). 1) старажытнаславянскі тэрмін ВІШ – 'балотная асака'; польскі WISZ – 'зарослае месца' [28, с. 191]. 2) балцкае ВІША – 'рака, ручай' [12]. 3) на фіна-вугорскіх мовах адпавядае значэнню 'пратока паміж азёрамі' (ВІС-), але, магчыма і ў значэнні 'мокры луг' [28, с. 191], 'забалочаны луг', 'забалочаны луг па рацэ, возеры' (ЛУГ такжа можа азначаць 'забалочаны'; напрыклад, ВІЧУГА – 'лугавая, балоцістая рака' [29]). Назвы ўжываюцца для лясных і леса-балотных, а такжа нізкіх забалочаных мясцін.

ВОЛЧАС (ВОЎЧЫЦА), рака ў Мсціслаўскім, Крычаўскім, Чэрыкаўскім раёнах, правы прыток р. Сож. Фіна-вугорская ВОЛ- – 'рака, паток, пратока': комі ВОЛ-/ОЛ- 'ручай, пратока', карэльскі тэрмін ВАЛУО – 'ліцца' (С-'возера'). Нельга ігнаравацъ версію, што ВОЛЧАС – 'рака без вусця; рака з занесеным вусцем', 'рака са складаным вусцем' (Волчас ўтварае у вусці возерападобнае пашырэнне).

ВОЛЫ, ручай у Аршанскім і Горацкім раёнах, правы прыток р. Бася. Фіна-вугорская ВОЛ- – 'рака, паток, пратока': комі ВОЛ-/ОЛ- 'ручай, пратока', карэльскі тэрмін ВАЛУО – 'ліцца'.

ВУДАГА, рака ў Чэрыкаўскім раёне, басейна р. Сож. 1) варыянт, калі гук –В- не з'яўляецца прыдадзеным да кораня тапоніма – ВУД – 'лясная', напрыклад, саамская назва Вудъявр – 'лясное возера' (у англійскай мове WOOD – 'лес'). 2) варыянт, калі гук – В прыстаўны, аснова УД(А)- – можа паходзіць ад старажытнаіндаеўрапейскага UDOR/UDOS у значэнні 'вада' [Манаков] і ГА- – 'рака'. Акрамя таго, марыйскае ВУД- 'вада'.

ВЫГАДА, возера ў Глускім раёне, басейна р. Зарудзеча, на нізінным балоце Выгада. Назва фіна-вугорская – ВЫГАДА на комі – 'возера-разліў', ' вада, якая разлілася'. ВЫ-/ВА- 'вада', ГД- 'балота'.

ВЯДЗЕРКА, рака ў Бялыніцкім раёне, правы прыток р. Друць. 1) ВЕДР- у сэнсе 'рэчышча' і фіна-вугорскі фармант –ЕРК (-ЕРХ) ад макшанскага ЭРХКЕ, эрзянскага ЭРКЕ – 'возера'. 2) ад ВЯД- у значэнні 'вада', WATER, WATAR, WASSER, UDOR –'возера'.

ВЯЛІКАЯ БАНЕЎКА (БАГУШЭЎСКІ) канал у Бабруйскім раёне. Назва ад населеных пунктаў.

ВЯХАВА, возера ў Бабруйскім раёне, басейна р. Вір (цячэ праз возера). Назва ў значэнні 'старая вада', 'старык', ВЕХ-/ВЕЦ- – 'возера, вада', фіна-вугорская ВЯТ- (ВЯТА, ВЯТКА, ВЯТНА) – 'вада'. Возера Вяхава і р. Вір – рукаў р. Бярэзіна.

ГАЛАВЕНЧЫЦЫ, ручай у Чавускім раёне, левы прыток р. Вілейка. Другасная назва – ад в. Галавенчыцы. Ручай цячэ у забалочанай мясцовасці. Э. Мурзаеў (1984) прыводзіць тэрміны ГОЛОМЯ, ГОЛОМЕНЬ –'адкрытая водная прастора' [17, с. 150], ад стараславянская ГОЛ- 'адкрытае месца, аддаленае месца, глыбіня'. Магчыма назвы ў значэнні 'глыбокі ручай на адкрытым месцы сярод балот'.

ГАЛОЎЧЫНСКІ канал у Бялыніцкім раёне. Этымалогія зразумелая – ад назвы в. Галоўчын.

ГАЛУБА, рака ў Краснапольскім і Слаўгарадскім раёнах, басейна р. Сож. ГАЛУБІНА, рака у Горацкім і Шклоўскім раёнах. ГАЛУБАЯ (БЛАКІТНАЯ) КРЫНІЦА, крыніца ў Слаўгарадскім раёне, помнік прыроды рэспубліканскага значэння. Усе гідронімы знаходзяцца ў нізкай, месцамі забалочанай мясцовасці (ГАЛ-), але назвы характарызуюць глыбіні (ГІЛ-; GELME, GILUS – 'глыбіня') у вытоках, вялікую глыбіню Галубой крыніцы (вада б'е з глыбіні каля 100 м), указвае на азёрныя віры.

ГАЛЫША (ГОЛЬША), рака ў Горацкім і Дрыбінскім раёнах, правы прыток р. Проня, БАЛОТА ГАЛЫША, у Горацкім раёне, праз яго цячэ рака. ГАЛА, ГАЛАЕ – 'паляна ў лесе', 'лясное балота', -ЫША/-ЫСА – 'возера, забалочанае возера'. Раён паміж рр. Проня і Бася заселены і асвоены са старажытнасці (высокі банітэт глебаў) – гістарычная вобласць БАСЕЯ (ВАСЕЯ). Э. Мурзаеў заўважае, што ГОЛЫШ –'валун', 'галька' [17, с. 150]

ГАНЧАНКА, рака ў Клічаўскім раёне, басейна р. Бярэзіна. ГАНЧАНСКАЕ БАЛОТА, балота ў Клічаўскім раёне, басейна р. Дняпро. В. Лемцюгова трактуе патамонім як славянскі, у значэнні 'хуткі' [12]). Але, Г(Х)АНЧ – 'хваёвае балота' [38]. Акрамя гэтага, венгерскае HANT- 'пагорак'. Магчыма значэнне – 'забалочаная рака сярод балотных пагоркаў'.

ГАРАДЗЕЧАНКА, рака ў Клічаўскім раёне. ГАРАДЗЕШНЯ, рака ў Клімавіцкім раёне. ГАРАДЗІШЧА, вадасховішча ў Шклоўскім раёне (назва ад в. Гарадзішча). ГАРАДОК, рака ў Горацкім раёне. ГАРАНКА, рака ў Мсціслаўскім раёне. 1) Частка назваў тыпу Гарадзішча – другасныя, ад старажытных паселішчаў – гарадзішчаў. 2) тэрмін ГАРА (балцкі адпаведнік GIRAS) – можа быць ужыты ў стараславянскім значэнні 'лес'. Э. Мурзаеў (1984) указвае, што, напрыклад, у сучаснай сербска-харвацкай мове ГАРА – 'гара' і 'лес', у балгарскай – толькі 'лес'; у славян ГАРА – першапачаткова толькі 'лясное ўзвышша'. Аналогія: горы – Чэшскі Лес, Тюрінгенскі Лес, Шварцвальд, Гарц (стары нямецкі тэрмін HARDT – 'лес'). 3) ГАРА – 'сухі і высокі бераг ракі'. Я. Паспелаў [23] выдзяляе віды: КЛІВА – 'незаросла голая вяршыня

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гары', ГОРБ – 'невысокая пакатая горка, пагорак'; АРШЫЦА – 'крутая камяністая гара, гара з даўгімі вострымі грэбнямі'; БЁРДА – 'крутая гара, скала, абрыў'. 4) ГАРА у значэнні 'балота' ('леса-балотная мясцовасць'), магчыма, гоцкага паходжання; у такім сэнсе славяне таксама маглі запазычыць гэты геаграфічны тэрмін.

ГІЖЭНКА (ГІЖНЯ, ТРОСЛІЎКА), рака ў Чэрыкаўскім і Слаўгарадскім раёнах, левы прыток р. Проня. Выток каля в. Гіжня Чэрыкаўскага, вусце каля в. Гіжэнка Слаўгарадскага раёна. 1) Сінанімічная назва Тросліўка мае фінавугорскую аснову ТР- , якая паказвае на азёрнасць (у вусці – возера) і хмызова-забалочаную мясцовасць. 2) Першая назва балцкая. В. Жучкевіч выводзіць патамонім ад GIZŪS – 'квашня, кіслае балота' [7, с. 70], што ў цэлым адпавядае характарыстыцы рачнога басейна. ГЖ- ад тэрміна ГЖЭЛ – 'хмызняк, кустоўе' [28, с. 91]. «Слоўнік... Паўночна-Заходняй Беларусі...» [27] прыводзіць паняцце ГІЗАС – «непаседа», што можа перадаваць характарыстыку рэчышча – шматлікія лукі, выгіны. У Полацкім раёне зафіксавана паняцце «гізаваць» ў значэннях 'круціцца, вярцецца, падскокваць', 'паводзіць сябе ў рухах здэнервавана'.

ГЛІНЕЦ, ручай у Чэрыкаўскім раёне. Назва можа характарызаваць грунты дна, паказваць на здабычу гліны мясцовым насельніцтвам, але часцей за ўсё падобныя назвы характарызуюць глыбіні, указваюць на віры, ямы: ГІЛ- ад балцкіх GELME, GILUS – 'глыбіня' [28, с. 219].

ГЛУСКІ канал у Глускім раёне. Этымалогія празрыстая – ад назвы г.п. Глуск.

ГНЕДКІ, канал у Клімавіцкім раёне, правы прыток р. Жадунька. Гідранімічны элемент ГН- балотнай семантыкі – 'лужына, балота', элемент канчатка -ЕЗ- 'рака, праток'. Напрыклад, у І. Яшкіна (2005) ГАНКАВІК – 'балоцістая мясціна за вёскай' [43, с. 186]. Г(Х)АНЧ – 'хваёвае балота' [38]. На іранскіх мовах ХАН- (таджыкскае) – 'крыніца, вадаём' [17, с. 590]. У варыянтнай назве другі корань УПА- у значэнні 'рака' (літоўскае UPE). Першы корань НЯТ- звязаны семантычна з асновам НЕС- 'балота'.

ГНІЛКА, рака ў Круглянскім раёне, левы прыток р. Друць. ГНІЛКА, рака ў Быхаўскім раёне, правы прыток р. Тошчыца. Назвы характарызуць балотныя ландшафты. Гідранімічны элемент ГН- балотнай семантыкі – 'лужына, балота'.

ГОРАНКА, рака ў Краснапольскім раёне, левы прыток р. Палуж. Тэрмін ГАРА можа быць ужыты ў варыянтах: стараславянскім значэнні 'лес', 'лясное ўзвышша'; ГАРА – 'сухі і высокі бераг ракі'. Беларускі народны геаграфічны тэрмін ГОРКА ўжываецца ў значэннях і 'пагорак', і 'сухая мясцовасць сярод балота' [43, с. 207]. Назвы групы ў значэннях 'рака сярод лясоў і балот, пагоркаў', 'возера сярод лясоў і балот, пагоркаў'.

ГОРАЦКА-СЛАБАДСКІ канал у Чэрвеньскім раёне. Этымалогія зразумелая – назва ад вв. Горкі і Слабодка.

ГОРЛАЎСКІ, ручай у Мсціслаўскім раёне, левы прыток р. Вербаўка. Славянскія ГОРЛА, ГІРЛА – 'протока'.

ГОРЫ, вадасховішча ў Горацкім раёне, на р. Быстрая. Этымалогія зразумелая – назва ад аг. Горы.

ГРАВА (ГРАЎКА, КАНАЛ ГРАЎКА), рака ў Асіповіцкім раёне, басейна р. Свіслач, упадае ў Асіповіцкае вадасховішча. ГР- 'возера' [1, с. 56]. У значэнні 'азёрная вада, рака з вытокам з возера, балота, рака, якая ўпадае ў возера'.

ГРАЗЬ (ПЛЯСНА), рака ў Чавускім раёне, левы прыток р. Раста. ГРАЗЬ – 'балота, дрыгва'. Назва ў значэнні 'забалочаная рака', альбо 'рака з вытокам з возера, балота' (ГР- – 'возера' [1, с. 56]). Варыянтная назва Плясна звязана з латышскім апелятывам PLACIS – 'балота, дрыгва'. [1, с. 87]. Корань ПЛ- – геланімічны.

ГРЭБЛЯ, рака ў Касцюковіцкім раёне. Усе рэкі цякуць у нізкіх забалочаных рэчышчах. ГРЭБЛЯ – гаці, 'вал для затрымання вады', насціл праз балота [43, с. 221]. Але назва можа быць і пераасэнсаванай – больш старажытная назва магла мець значэнне 'рака-балацянка, якая цячэ праз азёры і балоты' (на гэта ўказваюць асновы ГР- і БЕЛЬ).

ГРЭЗА, рака ў Магілёўскім і Быхаўскім раёнах, левы прыток р. Друць. А. Манакоў прыводзіць латышскі тэрмін GRIEZ ('круціцца, вярцецца') [13, 14], які характарызуе рэчышча з вірамі, лукамі (рака мае больш 50 заваротаў). А. Рогалеў (1999) вылучае часткі ГР- (перадача гукаў ракі) і ЕЗ(А) ('прыток, пратока') [25]. З тлумачэннем А. Рогалева першай часткі пагадзіцца немагчыма. Сапраўды ЕЗ-/ ЭС- – 'вялікая пратока, рака'. Галоўны прыток – р. Езва.

ПРУДОВАЯ ГУТКА, ручай у Касцюковіцкім раёне. ГУЦЯНКА (ЛЮБОНКА), рака ў Кіраўскім раёне, басейна р. Бярэзіна. HUS- –у значэнні 'возера, азёрная рака', 'рака з сажалкі'.

ДАБАСНА (ДОВАСНА, ДОБЫСНА), рака ў Кіраўскім, Жлобінскім і Рагачоўскім раёнах, правы прыток р. Дняпро. ДОБАСНА, вадасховішча ў Кіраўскім раёне. Назвы часта наіўна выводзяцца ад балцкай назвы канюшыны. Гідронімы скадаюцца з двух частак: ДАБ- і СНА-. Аснова ДАБ- блізкая да літоўскай асновы DAUBA – 'яр, лагчына' (В. Жучкевіч). Р. Аўчыннікава (2015) прыводзіць яшчэ адзін літоўскі тэрмін DUBURYS – 'паглыбленне, вомут'. SNA- – у гідраніміі звычайна азначае «цекчы, вільготнасць». Трэба дадаць, што індаеўрапейская аснова DOBRUN – 'вада' (як і ў кельтскай, старажытна-ірландскай мове) [38].

ДАБРАНКА, рака ў Горацкім раёне, правы прыток р. Галыша (вусце –у в. Добрая). ДАБРЫЦА, рака ў Кіраўскім і Рагачоўскім раёнах. Назвы кшталту Добрае, у большасці выпадкаў звязаны з архаічнымі формамі земляробства. Не выключаем уплыў кельцкай асновы DOBRUN – 'вада'.

ДАКЛОНЬСКІ канал у Клічаўскім раёне. ДАКОЛЬКА (ДАКОЛЬ), рака ў Старадарожскім і Глускім раёнах, правы прыток р. Пціч. Аснова КЛ- 'балотнае возера, балотны паток, струмень'.

ДАМАЛКА, рака ў Мсціслаўскім раёне. Аснова ДМ- трактуецца як 'ціхае балота'. Выток ракі з балота.

ДАРАНКА, рака ў Кіраўскім і Бабруйскім раёнах, правы прыток р. Ала. Назва ў значэнні

Электронный архив ОГБ библиотеки имени А. Кулешова

'ручай, рака ў забалочанай лагчыне, даліне, з вытокам з балота'.

ДАСКА (САЛТАНАЎКА, ДАШКАЎКА), рака ў Магілёўскім раёне, правы прыток р. Дняпро. Варыянтныя назвы ад в. Салтанаўка і аг Дашкаўка. У назве корань –ШК- у значэнні 'балота', ДА- 'вада', -А – 'рака'. Атрымліваем 'балотная рака, з вытокам з балота'. Варыянтная назва мае элементы САЛ- і -Т-, канчатак –АЎКА. У латышскай мове SALINA – 'астравок', SALA – 'мель на возеры ці на рацэ', прускае SALUS – 'дажджавы ручай', эстонскае SALMA – 'праліў' [11]. Л. Неўская [18] указвае, што геаграфічны тэрмін SALINIS выкарыстоўваецца ў сэнсе 'возера'. Корань САЛ– у фінскай мове азначае 'невялікі лес, лясны астравок, лес, тайга, глухі лес'. Назва Салтанаўка ў значэнні 'ручай, лясны ручай, ручай у лесе на балоце, маленькая рэчка'. На р. Салтанаўка адбылася бітва 11 (23) ліпеня 1812 г. рускага корпуса М. Раеўскага з французскім корпусам Даву. Гідронім Дашкаўка ў дачыненні да назвы ракі амаль не ўжываецца. У вусці знаходзіцца аг Дашкаўка, вядомая сваім палацам і вопытнай сельскагаспадарчай станцыяй. Назву пасялення памылкова звязваюць з імем К. Варанцовай-Дашкавай (1743–1810) – першай жанчынай ў свеце, якая кіравала Акадэміяй навук. Сяло Дашкаўка ў пісьмовых крыніцах узгадваецца ў 1597 г. Назва паходзіць ад ракі ДАСКА – ДАШКАВА.

ДАЎЖАНКА, рака (38 км) у Бялыніцкім і Клічаўскім раёнах, правы прыток р. Друць. Назва другасная ад назвы в. Доўгае. ДОЛ- – 'дол, нізіна, яр', дэмінутыўны фармант -АНКА можа выступаць ў значэнні 'выток з балота' (-ЯНК- 'балота', 'вільготная катлавіна, лагчына, вялікае балота', карэльскае ЯНК – 'махавое дрыгвяністае балота')[37]. Атрымліваем – 'рака, ручай у забалочанай нізіне', што поўнасцю адпавядае тапаграфічным умовам.

ДЗЕБРА, ручай ў г. Магілёве, правы прыток р. Дняпро. Патамонім можна тлумачыць з некалькіх пазіцый. Як характарыстыка даліны – 'невялікі лес', 'густы лес'. Акрамя таго, у значэнні 'глыбокі яр, лес, даліна, паток у цясніне, роў'. Сапраўды, ручай мае глыбокую даліну. Назва можа быць звязана са старажытнай індаеўрапейскай асновай DHEUBH – 'глыбокі'. ДЗВ-/ДЖ-/ДЗ- адпавядае паняццю 'вада (што рухаецца), рака', 'вялікая вада, рака', 'спакойная, ціхая'.

ДЗЕРНА, рака ў Шклоўскім раёне, левы прыток р. Бася. Магчыма: 1) аснова ДЗЕР(Б)- – у значэнні 'возера' аналагічна ЯРВІ і вытворным ад яго гідранімічным элементам тыпу Д'ЯРВ, ГАРВ, ВЕР; сувязь з беларускім апелятывам ДЗЕРБА, ДЗІРВАН (у І. Яшкіна – ДЗІРВАНЬ, 'аблога, дзірван, цэліна' [43, с. 238]) – 'цвёрдая зямля', з апелятывам ДЗЁРАН малаверагодна. 2) назва ў значэнні 'рака, што праходзіць праз густы, цяжкапраходны лес'(ДЗЁР – густы лес на Урале). ДЗВ-/ДЖ-/ДЗ- адпавядае паняццю 'вада (што рухаецца), рака', 'вялікая вада, рака', 'спакойная, ціхая'.

ДЗЯГАЎКА, ручай у Крычаўскім раёне, басейна р. Сож. І. Яшкін (2005) зафіксаваў беларускі геаграфічны тэрмін ДЗЯГНА – 'балота, багна' [43, с. 238]. У арэале фіна-вугорскіх гідронімаў рэкі маюць не толькі асновы ЙОКІ, ЙОГІ, ЙЫГІ, але і ДЗЕГІ. Не выключаем магчымасць удзелу ва ўтварэнні назваў асновы ДЗЕГІ-/ДЗЯГІ – 'рака'. ДЗВ-/ДЖ-/ДЗ- адпавядае паняццю 'вада (што рухаецца), рака', 'вялікая вада, рака', 'спакойная, ціхая'.

ДЗЯГЦЯРКА, рака ў Магілёўскім раёне, левы прыток р. Дняпро. Варыянтная назва р. Вільчанка. Народная этымалогія звязвае назву з вытворчасцю дзёгцю ў лясных будах, ад літоўскага апелятыва DEGUTINE – 'дзягцярня'; з якасцямі рачной вады – колер, запаволенасць плыні. Назва геланімічная. На гэта ўказвае беларусі геаграфічны тэрмін ДЗЯГНА – 'балота, багна' [43, с. 238]. Не выключана магчымасць сувязі з фіна-вугорскай асновай ДЗЕГІ-/ДЗЯГІ – 'рака' [41].

ДЗЯРАЖНЯ (ДЗЯРАЖАНКА), рака ў Клімавіцкім і Касцюковіцкім раёнах, басейна р. Сож. В. Жучкевіч звязвае назву ДЗЯРАЖНЯ з вытворчасцю гонты. Гідронімы маюць геланімічную семантыку. На гэта ўказваюць Э. Мурзаеў [17, с. 190], І. Яшкін (ДРАЖНЯ – 'забалочанае месца ў лесе') [43, с. 245]. Геаграфічны тэрмін ДРАЖНЯ мае балцкую аснову ДР- у значэнні 'возера пасярод забалочанага хмызняка', 'дрыгвяністае возера', 'рака, што цячэ праз забалочаныя азёры'. Магчыма і ў значэннях 'рака, што праходзіць праз густы, цяжкапраходны лес', 'леса-балотнае возера' (ДЗЁР – густы лес на Урале). ДЗВ-/ДЖ-/ДЗ- адпавядае паняццю 'вада (што рухаецца), рака', 'вялікая вада, рака', 'спакойная, ціхая'.

ДНЯПРО (ДНЕПР, ДНІПРО СЛАВУЦІЧ, у старажытнасці ВАР, ВАРУХ, БАРЫСФЕН), рака ў Расіі, Беларусі (600 км, у Дубровенскім, Аршанскім, Шклоўскім, Магілёўскім, Быхаўскім, Рагачоўскім, Жлобінскім, Буда-Кашалёўскім, Рэчыцкім, Гомельскім, Лоеўскім раёнах), Украіне, басейна Чорнага мора, чацвёртая па даўжыні (2201 км) у Еўропе пасля Волгі, Дуная, Урала. У Беларусі верхняя плыня ракі. Корань ДН-/ДАН-/ДУН – іранскі – 'рака', на кельцкай мове ДУН-/ДН- 'рака', латышскае DUNAS – 'іл, гразь'.

ДНЯПРЭЦ, вадасховішча ў Горацкім раёне, на р. Дняпрэц. Гідронім паходзіць ад назвы р. Дняпрэц.

ДНЯПРЭЦ, рака ў Горацкім раёне, правы прыток р. Быстрая (басейна р. Дняпр). Магчыма назва ў значэнні 'малы Дняпро'. Пры гэтым непасрэдна не звязана з р. Дняпро. Корань ДН-/ДАН-/ДУН – іранскі – 'рака', на кельцкай мове ДУН-/ДН- 'рака', латышскае DUNAS – 'іл, гразь'.

ДОБАСНА, вадасховішча ў Кіраўскім раёне на р. Добасна. Гідронім паходзіць ад назвы р. Добасна.

ДОБАСНА, рака. Гл. р. Дабасна. ДОБ-/ДАБ- – 'яр, лагчына', 'паглыбленне, вомут'. Корань ДОБР- звязаны з індаеўрапейскай асновай DOBRUN – 'вада' [38].

ДОМСА, рака ў Бялыніцкім раёне, правы прыток р. Запакулка. Магчымыя старажытныя варыянты назвы ракі – Домша, Домашня. ДМ- – 'ціхае балота', што адпавядае характарыстыцы асаблівасцей вытока.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ДОЎГІ МОХ, ручай у Чавускім раёне, басейна р. Дняпро. У назве зашыфравана ўказанне на выток з вялікага на плошчы махавога балота (МОХ-, МОС-).

ДРАГІЧЫН, возера ў Бабруйскім раёне, басейна р. Бярэзіна. Балцкая аснова ДР- у сэнсе 'возера пасярод забалочанага хмызняка', 'дрыгвяністае возера', 'рака, што цячэ праз забалочаныя азёры'. Гідронімаў з коранем ДР- у Еўропе вялікая колькасць. Найбольш вядомыя: Одра ў Чэхіі, Германіі і Польшчы; Одра ў Харватыі (прыток р. Купа); Одра ў Іспаніі; Драва ў Польшчы і Германіі, Драва ў Харватыі і Сербіі, а яшчэ дадаць сюды беларускія Дрыса, Друць і інш. У тапаніміцы назапашана вялікая колькасць гіпотэз і версій наконт значэння падобных назваў (некаторыя з іх разглядаў У. Георгіеў, 1958 [6, с. 257]). 1) Этнонім – ад плямён адрысаў, абадрытаў. 2) У. П'яноў (2005) спрабуе звязаць назвы з дзеясловам ДРАЦЬ [24, с. 281], бо нават, дровы – 'выдраны лес'. 3) Ад грэчаскага апелятыва ΟΔΟΣ – 'шлях', 'водны шлях' (напрыклад, на поўнач, як Одра, на поўдзень, як Дрыса альбо Друць). 4) Ад лацінскага ADU, ADRO – 'водны струмень', бо у 940 г. Одра называецца р. Адэра, а ў 968 г. як Адора. 5-6) Ад старажытнаеўрапейскага UDOR, або UDOS – 'вада', бо вядома сярэднявечная назва Віадрус; ад індаеўрапейскага DREU-/DRU- – 'моцны, цвёрды', цвёрды як дуб, 'з галінамі, як ў дрэва', бо і басейны рэк падобны на крону дрэва. 7) На санскрыце DRAVATI – 'бегчы, струменіцца, цякчы', а также 'драць, прадзірацца'. 8) Ад кельцкіх DERVO –'дуб', PHEDER – 'балота', напрыклад, назвы і р. Одра і р. Друць – DRUENTIA; р. Друенцыя ёсць і на поўдні Францыі («французская Друць»). 9) Геамарфалагічная версія выводзіць назвы ад старажытна-славянскага ОДР – 'ложа, ложак', г. азн. у значэнні 'ложа ракі' – 'рэчышча', якое «прадрана» вадой; ад дзеяслова драць і назва, напрыклад, АДРЫНА – сенавал. 10) Ад літоўскага DRUTAS – 'моцны, сільны'. 11) А. Манакоў спасылаецца на старажытнаеўрапейскі «водны» корань AHR- [14]. Усе гэтыя версіі зводзяцца да: 1) DR- 'вада'; 2) асноўныя і сінанімічныя назвы буйных рэк уключаюць корань ДР-, напрыклад, Одра ў кашубаў – Ведра, а у лужычан – Водра. 3) усе гідралагічныя аб'екты знаходзяцца ў лясных (ДР- 'дрэва', дрыяда – лясная німфа), пераўвільготненых і забалочаных (ДР- 'балота', 'возера') мясцовасцях. 4) Корань ДР- магчыма ўтварае адно сямейства семантычна блізкіх кораней, напрыклад, КР- (адна са старажытных назваў Одры – р. Ukra, якая дала назву племені украў, укран, назва замацавалася за адным з прытокаў Одры – Ucker на паўночным усходзе Германіі і за р. Wkra на тэрыторыі Польшчы). Аснова ДРАГ- сапаставімая з беларускімі геаграфічнымі тэрмінамі ДРЫГВА, ДРАГВА, ДРЫВІНА, ДРЫЧ, якія характаразуюць драгвяністы тып балотнай мясцовасці. [1, с. 60]

ДРАЖНЕЎСКІ (СІНЬКА), канал у Асіповіцкім раёне, левы прыток Пратасевіцкага канала. Этымалогія зразумелая – назва ад в. Дражня.

ДРАЖНЯНСКІ канал у Бабруйскім і Светлагорскім раёнах. Гідронім паходзіць ад назвы в. Дражня (вусце) Светлагорскага раёна.

ДРУЦЬ, рака ў Талачынскім, Круглянскім, Бялыніцкім, Магілёўскім, Клічаўскім, Быхаўскім, Рагачоўскім раёнах. Назва вельмі старажытная: у інда-еўрапейскіх версіях DR- – 'вада', DHRU- – 'цвёрды, пастаянны'; санскрытскія DRU- 'бегчы, рухацца', 'вядомы' (напрыклад, прысвячэнне Палярнай зорцы; DRUVA, DRUVA-TARA – Палярная зорка, або Гвозд /Цвік, Зорны кол). У літоўскай мове – 'моцная, цвёрдая, вялікая', у кельцкай DR – 'магутны, моцны, дуб'. Можна дапусціць версію, што першапачаткова DR- адносілася да абазначэння дрэва (інда-еўрапейскае DRU– 'лес'), а потым перайшло на абазначэнне рэк, бо малюнак рэк у рачной сістэме вельмі нагадвае кроны дрэў, як дрэвы прадзіраюцца ў лесе да сонейка, так і рэкі прабіваюць свае рэчышчы на паверхні зямлі; ад DR- – славянскае 'драць' [38]. Р. Аўчыннікава (1993) балцкую аснову ДР-тлумачыць у значэнні 'возера пасярод забалочанага хмызняка', 'дрыгвяністае возера', 'рака, што цячэ праз забалочаныя азёры'.

ДУБРАВЕНКА, рака ў Магілёўскім раёне, правы прыток р. Дняпро. З берагоў гэтай ракі пачаўся Магілёў. Аснова ДУБР-, суфікс - АВА – 'вада' і дэмінутыўны фармант -ЕНКА. Элемент ДУБ- – у славяна-балтаў меў азначэнне 'вада ў паглыбленні' (літоўскія – DUBE, DUBUS, DUBURAS – 'яма, упадзіна; глыбокі'; 'вір, западзіна'; латышскі DUBRAJAS – 'балота, топкае месца'), што супадае па значэнню і з кельцкімі тэрмінамі DUBH – 'чорны', DUBRO (DUBRON) – 'вада'. Назва пайшла ад некалі забалочанага вусця.

АСТРАВЫ ДУЛЕБЫ. ДУЛЕБСКАЕ, балота. ДУЛЕБІЦА (ДУДЛЕБІЦА), ручай (усе на тэрыторыі ДУЛЕБСКАЙ ПУШЧЫ). Першая версія этнанімічныя – ад дулебаў, дудлебаў (валынян, бужан) – ад першага вядомага буйнога аб'яднання ўсходніх славян, рэшткі якога пад націскам авараў (не выключана, што самі авары – славяне) адыйшлі на тэрыторыю міжрэчча Друці і Бярэзіны (далей – да Пасожжа). Дулебы, па версіі А. Бычкова (2007), апошні славяна-германа-балцкі саюз (DAUD-LAIBA, «спадчына памерлага» [4]). Пры гэтым, яцвяжскае DULIS – 'цёмны, патаемны, загадкавы' (магчыма звязана з NARUS – неўрамі) альбо DULGT – 'імжа', DUL'AVA – 'туман і дождж' [38]. Назвы ў значэнні 'вільготны, балотны'. Акрамя таго, корань ДУД- семантычна блізкі гідронімічнай фіна-вугорскай аснове ТУД- 'возера'.

ДУЛЕБСКІ канал у Клічаўскім раёне. Гідронім паходзіць ад назвы в. Дулебня (у вусці).

ДУНАЁК, назвы двух ручаёў на поўдні г. Магілёва, ручай у Быхаўскім раёне. ДУНАЁК, канал на паўнёвым захадзе г. Магілёва (левы прыток р. Дняпро). ДУНАЁК, ў Кіраўскім раёне. ДУНАЙКА, рака ў Кіраўскім раёне (правы прыток р. Вепрынка). Гідронімаў з асновай ДУНАЙ у Еўропе, Беларусі дастаткова. Выдзелім старажытна-іранскі корань ДАН-/ДН – 'рака'. І. Яшкін указвае, што ДУНАЙ – 'часовы вадаём, які ўтварыўся ў час дажджу або разліва ракі' (гэту акалічнасць узгадваў і В. Жучкевіч) [43,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

с. 252]. Паходжанне гідронімаў часта звязваюць з дулебамі. У Іўеўскім раёне назіраецца цікавае спалучэнне гідронімаў Дайнова (балцкае – «песьня»; племя дайнова; у азначэнні – «гоман (дайна) вады») і Дунай. Гэта наводзіць на думку, што гэтыя гідронімы кельцкія, старажытнаеўрапейскія (AVA – 'рака') [38]. Геаграфічны тэрмін ДУНЕЦ можа супадаць па значэнню з латышскай DUNAS – 'іл, гразь'. У І. Яшкіна (2005) ДУНОВІНА – 'дрыгва' [43, с. 252]. Яшчэ адно цікавае назіранне: частае чаргаванне асноў ДН- і ВІЛ-.

ЕЗВА (ЕЗАЎКА), рака ў Быхаўскім раёне, левы прыток р. Грэзы. Варыянтную назву Езаўка рака атрымала ад в. Езва (існавала да 2011 г.). Першая назва – Езва мае канструкцыю ЯЗ-/ЕЗ-/ЕЖ- (ЭС- – у значэнні 'рака, праток') і ВА- ('вада'). Рака пачынаецца ў забалочанай мясцовасці, на месцы былога возера (СЕ- – 'пратока', 'рэчка, якая выцякае з возера'). Дапускаем і ўтварэнне ад пазнейшай фіна-вугорскай гідранімічнай асновы СВ-/ЗВ- у значэнні 'возера' (А- ад апелятыва РАКА). Пры гэтым, В. Жучкевіч і Э. Мурзаеў прыводзяць геаграфічныя тэрміны ЕЗВА – 'пясчаны нанос або водмель каля берага ракі, старарэчча, заліў ракі' [7, с. 116], 'перакат на рацэ' [17].

ЕЛАВЕЦ, ручай у Клімавіцкім раёне, левы прыток р. Перавалочня. ЕЛЕНКА, рака ў Хоцімскім, ЕЛЕНКА, рака ў Клічаўскім і Чэрыкаўскім раёнах. 1) фітапатамонімы – ад назвы пароды дрэва – ЕЛКА, але гэта малаверагодна. 2) Фіна-вугорская аснова ЕЛ-/ЁЛЬ (комі) у значэнні 'струмень, ручай' [1, с. 65].

ЕЛЬНЯ, рака ў Краснапольскім і Слаўгарадскім раёнах, левы прыток р. Сож. 1) фітапатамонім –ад назвы пароды дрэва – ЕЛКА, але гэтая версія малаверагодная. 2) Фіна-вугорская аснова ЕЛ- у значэнні 'струмень, ручай' [1, с. 65].

ЖАВУНІЦА (СТОШЫНА, ЖАЎНІЦА, СТОШЫЦА), рака ў Краснапольскім і Кармянскім раёнах, левы прыток р. Сож. В. Жучкевіч (1974) паўтарыў версію А. Пагодзіна (1901) паходжання назваў ад літоўскага ŽUVINAS – 'рыбны'. ЖВ- – 'ручай з возера ці балота', альбо 'выток з балотнай крыніцы' (фінскія SOINEN, SUO –балота як крыніца для ракі; у сэнсе рака, што выцякае з балота (возера) [37]. Вядомы беларускія мясцовыя геаграфічныя тэрміны ЖЫВЕЦ – 'топкае месца, багна; гнілое балота, язвіна', 'крынічнае месца' [43, с. 264]. Магчыма, што ў варыянтнай назве С- – 'балота', -ТО-/-ТОШ-/-ТАШ- – 'возера' – указанне на выток з азярыны, балаціны, -ЫЦА/-ІЦА/-ІЧА – 'паток, рака'. Акрамя ўсяго, ШАБ- 'мелкае, абмялеўшае возера'.

ЖАДУНЬ (ЖАДУНЬКА), рака ў Клімавіцкім і Касцюковіцкім раёнах, правы прыток р. Беседзь. ЖАДУНЬ, рака ў Хоцімскім раёне і Бранскай вобласці Расіі, левы прыток р. Бесядзь. Гідранімічная аснова ЖАД- / ЖУОД – 'нізіна ў лесе, нізкае месца' [40] і назвы ў значэнні 'забалочаная рака'. Па версіі Р. Аўчыннікавай у значэнні 'вада, рака'.

ЖОВІН, возера на мяжы Кіраўскага і Клічаўскага раёнаў, у пойме р. Бярэзіна. Малаверагодна паходжанне лімноніма ад літоўскага ŽUVINAS – 'рыбны'. ЖВ- – 'ручай з возера ці балота', альбо 'выток з балотнай крыніцы' (фінскія SOINEN, SUO –балота як крыніца для ракі; у сэнсе рака, што выцякае з балота (возера) [37].

ЖЫВАРЭЗКА (СЯННА), рака ў Магілёўскім раёне, правы прыток р. Лахва. Назва ўспрымаецца ў значэннях ' рака, якая не замярзае, рака, якая багата на кісларод, незастойная; рака, якая ўвесь час «працуе» –«праразае» даліну'. Корань ЖЫВ- ужыты ў значэнні 'ручай, лясны ручай, ручай у лесе на балоце, маленькая рэчка' (SUO – 'балота'), суфікс –Р- (ад мардоўскага апелятыва ЭРЬКЕ – 'возера'), канчатак –ЭСКА азначае (ад фіна-вугорскага элемента ЭС – 'вялікая пратока, рака'. У варыянтнай назве корань СЯН- – на комі 'лагчына, якая заліваецца вадой' [17, с. 503].

ЖЫЛЕЎКА, рака ў Чавускім раёне, правы прыток р. Проня. Назва ўспрымаецца ў значэнні 'рака, якая не замерзае', 'месца, адкуль бруіцца вада', 'жывая вада, вада, якая ўвесь год цячэ' [37]. Корань ЖЫЛ-/ЖЛ-/ЗЛ- са значэннем 'вільготнае месца, балота'. Патамонім ў значэнні 'балотная рака з вытокам з балота, балотных крыніц'. Беларускі народны геаграфічны тэрмін ЖЫВЕЦ выкарыстоўваецца ў значэннях 'частка ракі, якая зімой не замерзае, крынічнае месца', 'топкае месца, багна; гнілое балота, язвіна'. Корань ЖЫЛ- такжа можа азначаць (ЖЭЛЬ, ГЖЭЛЬ) – 'вільготныя зараснікі', 'дробны лес, хмызняк' [38].

ЖЫЩІНКА, рака ў Асіповіцкім раёне, левы прыток р. Свіслач. ЖЫЦ- фіна-вугорская гідранімічная аснова 'нізіна ў лесе, нізкае месца'.

ЗАБАВА (КАНАЛ ЗАБАВА), рака ў Быхаўскім раёне, левы прыток р. Макранка. Назвы Забава, Макранка перадаюць тапаграфічныя ўмовы – вільготная, забалочаная мясцовасць. БАВА/ БАБА – 'трасіна, зыбкае месца на балоце', 'дрыгва' [43, с. 75]. БА-/БАЛ- – 'балота' [1, с. 38]. Старажытная індаеўрапейская аснова – ОВ-/-АВ- – 'вада'; кельцкае ABU- – 'рака' [1, с. 39]. Магчыма трансфармацыя фіна-вугорскіх асноў ЗАБ-/ЖАБ- у значэнні – 'нізіна ў лесе, нізкае месца'.

ЗАГРАБЕЛЬСКІ, канал у Глускім і Любанскім раёнах. Прэфікс ЗА- – арыенцір. ГРЭБЛЯ – 'плаціна, земляны насып праз топкае месца'.

ЗАПАКУЛКА (ПАКУЛЛЕ, ПАКУЛКА), рака ў Бялыніцкім раёне, левы прыток р. Няропля. Прэфікс ЗА- (пазнейшы, славянскі; адсутнічае ў сінанімічных назвах), два кораня: ПАГ- (фінскі РОНІА, вепскі РОНG, карэльскі РОНD – 'дно, крайняя частка заліва', угорскі ПЁХ – 'невялікая рэчка', нянецкі ПАХА – 'бухта, заліў' [1, с. 85]), УЛ- – ад мардоўскага JUL – 'рака', комі – 'вільготны'. У значэнні 'забалочаная рака'.

ЗАРУДЗЕЧА, рака ў Глускім раёне, правы прыток р. Пціч. Можа быць назвай-арыенцірам. РУДА, РУДЫ – колер балотнай вады. Ф. Мількоў звязваў корань РУД- з усялякім вільготным паніжэннем. Пры гэтым, аснова РУД – 'рака' у іранскіх мовах, ад RAUTA –

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

‘рака’, старажытнаіндыйскага SRAV/SRUTA – ‘цячэнне’ [37].

ЗАРЭСЦЕ, вадасховішча ў Магілёўскім раёне, на р. Раста, каля в. Зарэсце. Этымалогія зразумелая – ад назвы в. Зарэсце.

ЗУБАР (ЗУБР, ЗУБРА), рака ў Касцюковіцкім раёне, левы прыток р. Беседзь. Назва ўспрымаецца як зоанімічная, але такой не з’яўляецца. ЗУБ-/ШУВ- – ‘вада, рака’, ‘ручай, лясны ручай, ручай у лесе на балоце, маленькая рэчка’; ШУО- ‘балота’, БАР-/ВАР- ‘возера’, ‘забалочанае возера’; комі ЖУВÖД – ‘балоцістае месца з хмызняком’ [2]. БАРА – старажытнаславянскі тэрмін у значэнні ‘балота’. Назва ў значэнні ‘леса-балотная рака з вытокам з возера, балота’.

ЗЯРНЯ, рака ў Дрыбінскім раёне, правы прыток р. Проня. У вытоку в. Бір (БІР- – ‘балота, нізкае месца’, ‘вільготнае месца’). Корань ЗЯР- магчыма звязаны з JARVI – ‘возера’, САР- – ‘возера’, -Я – ‘рака’. Назва ў значэнні ‘рака з вытокам у нізкім, вільготным месцы, з возера, забалочанага возера’.

ІВАНАЎСКІ, канал у Клічаўскім раёне, левы прыток р. Нясета. Этымалогія простая – назва паходзіць ад в. Іванаўка.

ІЗБІНКА (УЗБІНКА), рака ў Быхаўскім раёне, левы прыток р. Друць. Аснова УЗБ- (успрымаецца ў значэнні ‘вузкая’ [37]) і дэмінутыўны фармант –ІНКА. Больш стары корань ІЗБ- ‘крыніца, выток ручая, ракі’ [11; 17, с. 222, 230], ‘глыбокае месца (з хуткім цячэннем), якое не замерзае зімой’[37], ‘вузкая крынічная рака’.

ІПУЦЬ, рака ў Магілёўскай, Смаленскай і Бранскай абласцях, левы прыток р. Сож. Дзве асновы ІП і УЦЬ. 1) версія фінамоўнага паходжання В. Жучкевіча (1974) – ад HYPPY – скачок, скокаць (шматлікія назвы ў Фінляндыі, Комі, Венгрыі – Іперы, Іпе, Іпі, Іпікі, Іпель, Іпой і інш.) [7, с. 147]; версія ў значэнні ‘царскі шлях’, ‘шлях фіна-вуграў’. 2) Балцкая версія – ‘святая рака’. 4) Патамонімы з асновай УЦЬ/УТ- распаўсюджаны ад Беларусі да Далёкага Усхода: Ута (Вата) – у Чувашыі, Ута – у Хабараўскім раёне; Ута – прыток р. Об; Ут – дзве ракі ў Свярдлоўскай вобласці; Вуць (Уть) – ва Удмурціі і г.д. 5) Ірана-фінна-вугорская назва УТЬ – ‘вада’ [20, с. 26]. 5) Ад індаеўрапейскага кораня *UIS- – ‘вада, рака’. Калі злучыць дзве асновы – ‘хуткая рака, з хвалямі’.

КАГАЛЬНЫ КАЛОДЗЕЖ, КАГАЛЬНЫ РУЧАЙ, КАГАЛЬНЫ СТАВОК. Назвы адносяцца галоўным чынам да невялікіх аб’ектаў. КАГАЛ (לָקָח, кахал – ‘абшчына’) – форма габрэйскага самаўпраўлення ў Рэчы Паспалітай (XYI–XYIII стст.), у Расійскай імперыі (1772–1844 гг.). Усе аб’екты знаходзяцца ў частках гарадоў і мястэчак з кампактным пражываннем у свой час габрэяў, каля габрэйскіх могілак, каля аб’ектаў, якія даглядалі габрэі (Кагальны Роў у Магілёве) па распараджэнню магістратаў, абслугоўвалі (габрэі займаліся забеспячэннем вадой амсціслаўцаў з Кагальнага калодзежа, раней крыніца Здаравец, у Кагальным Рве паміж Замкавай і Троіцкай гарамі г. Амсціслаў).

КАЗЁЛ (КАНАЛ УДОЖКА, ЗАСЦЕНКІ), рака ў Чэрыкаўскім раёне, левы прыток р. Удога. Патамонім не з’яўляецца зоанімічным – ні ад хатняй, ні ад дзікай жывёл (казёл). КАЗ-/КАС- балцкае – ‘крывое, звілістае’ (латышскае KASIS – ‘кручок’), КАС/ХОС у вугорскіх мовах – венгерскае HOSSU і мансійскае ХОСА – ‘доўгае’ [1, с. 69]. Корань КАЗ- у геаграфічных тэрмінах КАЗЁЛ – ‘вомут, вір’ [17, с. 282], беларускіх КАЗЕЛЕЦ – ‘нізкае лугавое месца, дзе расце атрутны казялец’, КАЗЁЛ – ‘балота’ [43, с. 325]. КАЗЁЛ – ‘вомут, вір’ [17, с. 282].

КАЗЁННЫ КАНАЛ у Кіраўскім раёне, басейна р. Суша. Казённы – у значэнні дзяржаўнай уласнасці, пабудаваны на казённыя грошы.

КАЛІНКА (КАЛІНІЦА), рака ў Клімавіцкім раёне, левы прыток р. Лабжанка, на рацэ – г. Клімавічы. Усе назвы ў значэнні ‘забалочаная рака, рака з вытока з балота’. Гэта падцвярджаецца і варыянтнай назвай з коранем ГН- – ‘лужына, балота’. Малаверагодна паходжанне назваў ад фінскага KALAJOKI –‘рыбная рака’, ад асабістага імя Каліннік. Сувязь з назвай хмыза КАЛІНА, які ўказвае на вільготнасць месца. У беларускай геаграфічнай тэрміналогіі КАЛІНІЦА – ‘вільготнае месца, дзе расце кустоўе каліны’ [43, с. 330].

КАМАРЫНКА, ручай у Глускім раёне, левы прыток р. Зарудзеча. Індаеўрапейскі КАМ-/КОМ- ‘даліна’, удмурцкі КАМ- ‘рака’, ‘струмень’, -АР- ‘рака’. Але -АР- можа быць звязана з РЫН, РЕНЬ, РЫНТА – ‘водмель, нізкі бераг’ [37], з фінскім ARO – ‘балотны луг на беразе ракі або возера’, карэльскім ARO – ‘неглыбокі рачны заліў з хвашчовай травой’ [17, с. 53–54].

КАМЕНКА, назва паўтара дзесятка беларускіх рэк у раёнах: Асіповіцкім (правы прыток р. Бярэзіна), Краснапольскім і Слаўгарадскім (левы прыток р. Сож), Круглянскім (правы прыток р. Друць), Крычаўскім (басейна р. Сож); Шклоўскім і Аршанскім (басейна р. Дняпро); Чавускім (левы прыток р. Проня), Чэрыкаўскім (левы прыток р. Проня) і г.д. Усе назвы з’яўляюцца характарыстыкамі дна, берагоў. Не выключаецца сувязь з індаеўрапейскім КАМ-/КОМ- ‘даліна’, удмурцкім КАМ- ‘рака’, ‘струмень’. Увогуле, трэба нагадаць пра семантычную еднасць паняццяў КРЫНІЦА – ВОКА – ШКЛО – КАМЕНЬ. [1, с. 40].

КАМЯНІЦА (КАМЕНКА), рака ў Шклоўскім і Аршанскім раёнах, правы прыток р. Чарніца. Назва-характарыстыка дна, берагоў. Не выключаецца сувязь з індаеўрапейскім КАМ-/КОМ- ‘даліна’, удмурцкім КАМ- ‘рака’, ‘струмень’.

КАПУСНІК, рака ў Шклоўскім раёне, левы прыток р. Дняпро. Корань КАП- этымалагічна звязаны з фінскім KUOPPA, вепскім і карэльскім КОР- – ‘яма’. Корань варыянтнай назвы КАС- ‘доўгае’ [1, с. 69].

КАПЧАНКА, рака ў Асіповіцкім раёне, правы прыток р. Бярэзіны. Назва ў значэнні ‘невялікая забалочаная рака, з вытокам з забалочанай лагчыны, ямы, балота’.

КАРМАНОЎСКАЕ возера ў Бялыніцкім раёне, басейна р. Клява. Назва другасная – ад назвы в. Карманоўка. Вылучаем два кораня КАР- і –МАН. КАР- у значэнні ‘забалочанае’, КАРА- – ‘заліў’ (возера на поўначы і ўсходзе мае залівы), -МАН – ‘невялікая, звілістая азёрная

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рэчка' (з возера выцякае ручай ў воз. Заазерскае, раней злучалася з азёрамі на поўначы). Магчыма сувязь і з беларускім тэрмінам КАРМА – 'затока, завадзь у форме рукава, выступ сушы, які ўразаецца ў балота' [43, с. 346].

КАРОЎЧЫНА, вадасховішча ў Дрыбінскім раёне, на р. Касінка. Этымалогія зразумелая – ад назвы аг. Кароўчына.

КАСАЛЯНКА (КАСЯЛЯНКА, ПЕРАГОНКА), рака ў Слаўгарадскім і Кармянскім раёнах, правы прыток р. Сож. Мала верагодна версія ад фінскага KASKI, вепскага KASK – 'пажога', г. азн. поле, якое ўтварылася на месцы спаленага леса. КАС/ХОС у вугорскіх мовах – венгерскае HOSSU і мансійскае ХОСА – 'доўгае' [1, с. 69]. Фіна-вугорскае КОС- – 'хуткая', карэльскае і фінскае КОСКІ- 'парог', комі КОСЬ – 'перекат', комі-пермскі КОСІ- 'мель, водмель, пясчаная каса'. -САЛ- 'рачны прыток, рукаў, развіліна', мансійскае –ЯНК-, карэльскае -ЯНГА- 'махавое дрыгвяністае балота'.

КАСІНКА (КАСУЛЯ), рака ў Дрыбінскім раёне, левы прыток р. Бася. Фіна-вугорскае КОС- – 'хуткая', карэльскае і фінскае КОСКІ- 'парог', комі КОСЬ – 'перекат', комі-пермскі КОСІ- 'мель, водмель, пясчаная каса'. -УЛ-/-УЛЯ – 'рака, праток'.

КАСТРЫЧКА (КОСТРЫЧКА), рака ў Кіраўскім і Клічаўскім раёнах, басейна р. Дняпро. Гідранімічны корань СТР- – 'вада, рака' [29]. Р. Аўчыннікава (2015) вылучае балцкую аснову КАЗ-/КАС- – 'крывое, звілістае' (ад латышскага апелятыва KASIS – 'кручок'). КОС- /КОШ- фіна-вугорская аснова: комі 'рачны парог, перакат на рацэ' [17, с. 300], КОСЬЮ – 'мелкая рака, якая перасыхае' [17, с. 640], комі КОСЬ – 'перекат', комі-пермскі КОСІ- 'мель, водмель, пясчаная каса'. Другі корань -ТР- фіна-вугорскі і ўказвае на азёрнасць і забалочанасць мясцовасці.

КАЎПІТА (КАНАЛ БЯРЛЯНКА), рака ў Краснапольскім, Чачэрскім раёнах і па мяжы з Веткаўскім раёнам, правы прыток р. Беседзь. Аснова КАЛ-(КАЎ-/КОВ) /КЛ- у значэнні 'выток з возера, балота'; ЛАПІТА – 'нізіна' (у марыйскай мове). КАЎ-/КАЛ-/КОЛ-/КОЛП-/КАЎП- 'астраўкі з азёрамі з больш светлай вадой сярод забалочанага лесу'. КАЎП- – 'яма ў рацэ' (украінскія геаграфічныя тэрміны КОВБОТА, КАВДОБА, беларускія – КАЎДОБА, КАЛДАБА – 'яма з вадой на лузе', 'яма, якая ўтварылася ад цячэння вады вясной, а таксама рыцвіна ад вады на лузе або на дарозе' [43, с. 350]), 'рака з вытокам з ямы'. Магчыма сувязь з балцкім гідранімічным коранем UPE – 'рака'.

КАЧАРАГА, ручай, да пач. XX ст. на тэрыторыі Магілёва, левы прыток р. Дняпро, паміж першай і другой надпоймавымі тэрасамі, выток з воз. Святое (Грэбянёўскае). Назва ў значэннях: 'крывая рака', 'рака, што цячэ паміж кочак' (КОЧА – 'сухое месца на балоце' [17, с. 297]. КАЧАРЭЖ, КАЧАРЭЖНЯ – 'клюкаваты, дробны лес'. Сувязь з тэрмінам КАЧАРГА ад 'качурыцца – паміраць', 'знікаць' [35; 17]. Усе азначэнні падыходзяць да ўмоў ручая.

КАШАНКА, рака ў Мсціслаўскім і Чавускім раёнах, левы прыток р. Проня. Корань КАШ (чаргаванне Ч і Ш) выкарыстаны ў значэннях з саамскага 'водмель', комі КОСЬ- 'водмель', у марыйскай КУАШ – 'мелкі'. Корань КАШ- звязаны семантычна з КАЦ-, КАТ-, КАД- – усе выкарыстоўваюцца ў значэннях 'балота, дрыгва'(SUO – 'балота').

КЕЧКАЎКА (БОТЧА), рака ў Асіповіцкім раёне, левы прыток р. Свіслач (бас. Дняпра). Аснова другой назвы БОТЧ- – 'ніз, нізкае месца', 'азёрны заліў, затока, губа'. Можа быць семантычна звязана са славянскімі – БОЧА, БОЧАГ, БАЧЭЙКА – 'яма на дне ракі, возера, балота, вір'. Першая назва павінна мець тыя ж азначэнні. Корань КЕЧ- выкарыстаны ў значэннях 'ручай, лясны ручай, ручай у лесе на балоце, маленькая рэчка', 'рака', 'вялікая пратока, рака'.

КЛЯВА, рака ў Бялыніцкім і Бярэзінскім раёнах, левы прыток р. Бярэзіна. У старадаўнія часы Клява – назва р. Ольса (Ольса – як рукаў Клявы) [38]. Канструкцыя гідраніма: аснова КЛ- і канчатак -АВА (-ЕВА, -ЯВА; 'вада'). 1) В. Верас услед за В. Жучкевічам спрабуе тлумачыць гідронім як фітатапонім – ад літоўскага KLEVAS – 'клён' [7, с. 159], што не адпавядае рэчаіснасці. 2) КЛ-/КЛА- – 'рака, даліна' [29; 9], 'лука ракі', 'рачны паўвостраў'. 3) Геланімічная версія – 'тапіла, дрыгва, балота, поймавы луг, вялікая лужая лужа'; А. Манакоў прыводзіць латышскі апелятыў KLAJS – 'адкрыты' [13]; фіна-вугорскі КЛ- – 'балотнае возера, балотны паток, струмень', мансійскае KEL, хантскае KAL – 'балота' [17, с. 239]. 4) Э. Мурзаеў (1984) дае адзін з варыянтаў апелятыва КЛЯВА / КЛІВА – 'гара, вяршыня, пагорак' над вадой, край лесу, 'высокі і густы ельнік'. І. Яшкін прыводзіць тэрмін КЛАЎКА – 'пагорак, узвышша' [43, с. 355]. 5) Дапускаем чаргаванне гукаў КЛ- ад СЛ-/СЕЛ-, СЛ- звязаны з тэрмінамі фінскім SALMI – 'праліў', прускім SALUS – 'дажджавы ручай'.

КЛЯПІНКА (БУДЗЯНКА), рака ў Краснапольскім і Кармянскім раёнах, левы прыток р. Сож. Вытворная назва ад в. Кляпін. Тэрмін Кляпіца І. Яшкін тлумачыць як 'месца, дзе была кузня' [43, с. 358], што не можа датычацца гідронімаў. КЛ-/КЛА- – 'рака, даліна' [29; 9], 'лука ракі', 'рачны паўвостраў', КЛ- 'балотнае возера, балотны паток, струмень'; мансійскае KEL, хантыйскае KAL – 'балота' [17, с. 239]. КЛЯП – 'пясчанае месца на рацэ», 'пясчаны затор у рэчышчы'.

КОПЫЛКА, ручай у Горацкім раёне, левы прыток р. Паросіца. КОП- – 'неглыбокі калодзеж, мелкая канава', у фінскай, вепскай мовах KUOPPA – 'яма', карэльскай КОР- 'яма' [13]. Акрамя таго, КОПА – 'балотца', КОПАНЬ – 'крыніца' [17, с. 289]. Калісці выцякаў з невялічкага забалочанага возера, цёк у забалочаным рэчышчы (пасля меліярацыі каналізаваны), на ручаі крыніцы, цячэ праз сажалкі.

КОРМНА, ручай у Краснапольскім раёне, левы прыток р. Тур'я. Вепскі тэрмін КАР- 'затока', хантыйска-мансійскі КОР- 'вільготнае, травяністае балота', 'рака з балотам і лесам па беразе'; -МН- ад МОНГА – 'балота, топкае месца, тарфянік', альбо МН- 'невялікая, звілістая азёрная або балотная рака, ручай'. В. Лемцюго-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ва (2008) тлумачыць як ‘затока, завадзь у форме рукава’ [12].

КОСМЫНЬ, канал у Бабруйскім раёне, басейна р. Ваўчанкі. Корань КОС-/КОШ- выкарыстаны ў значэннях ‘балота, дрыгва’ і канчатак МЫНЬ (або другая аснова МЕН-). Магчымы і іншыя надыходы да вылучэння кораня - СМ-/СОМ-.

КОСТРЫЧКА (КАСТРЫЧКА), рака ў Кіраўскім і Клічаўскім раёнах, басейна р. Дняпро. Гідранімічны корань СТР- – ‘вада, рака’ [29]. Р. Аўчыннікава (2015) вылучае балцкую аснову КАЗ-/КАС- – ‘крывое, звілістае’ (ад латышскага апелятыва KASIS – ‘кручок’). КОС- / КОШ- фіна-вугорская аснова: комі ‘рачны парог, перакат на рацэ’ [17, с. 300], КОСЬЮ – ‘мелкая рака, якая перасыхае’ [17, с. 640], комі КОСЬ – ‘перекат’, комі-пермскі КОСІ- ‘мель, водмель, пясчаная каса’. Другі корань -ТР- фіна-вугорскі і ўказвае на азёрнасць і забалочанасць мясцовасці.

КРАСНАЯ (КАРЧАНКА) меліярацыяная канава ў Асіповіцкім і Глускім раёнах. Этымалогія зразумелая – назва ад в. Красная Асіповіцкага раёна (у вытоку).

КРАСНАЯ, рака ў Асіповіцкім, Бабруйскім і Глускім раёнах, левы прыток р. Пціч (у Асіповіцкім раёне цячэ і р. Сіняя). Назва колеравай характарыстыкі, спалучаецца з назвамі СІНЯЕ, ЧОРНЫ. Усе звязаны з водна-балотнымі ўмовамі. Красны – руды колер балотнай вады, колер ад гліністага дна, гліністых берагоў, ад берагоў чырвонага колеру пяскоў. Назва можа паходзіць ад чырвоналесся – лясоў з хвоі. Не выключаем і еувязі з балцкім KRASTS – ‘бераг, край, мяжа’.

КРУПКА (ЗАКРУННІЦА), рака ў Чавускім і Слаўгарадскім раёнах, левы прыток р. Проня. КРУПКА (РУТКА), рака ў Круглянскім раёне, левы прыток р. Аслік. КРУПНЯ, рака ў Клімавіцкім і Касцюковіцкім раёнах, левы прыток р. Жадунька. КРУПЯНКА, рака ў Клімавіцкім і Касцюковіцкім раёнах, левы прыток р. Жадунька. У славянскай інтэрпрэтацыі – ‘крыніца, рэчка, незамярзаючая зімой’. І. Яшкін (2005) прыводзіць беларускія геаграфічныя тэрміны КРУПЕЦ, КРУПКА – ‘незамярзаючы кароткі прыток’ [43, с. 368]. Але трэба ўлічваць, корані КР- і –УП- (UPE – ‘рака’), або ПЕЛЬ – у сэнсе ‘возера сярод забалочанага месца на беразе ракі’, -ПЛ-/-ПАЛ ад індаеўрапейскага кораня *PAL –‘балота, дрыгва’, літоўскага PALA – ‘балота або абмялеўшае возера’. Усе назвы водна-балотнай семантыкі.

КРУЦІЦКІ канал у Бярэзінскім і Клічаўскім раёнах, левы прыток р. Нясета. Назва адлюстроўвае і даўжыню, і хуткасць струмення паміж забалочаных мясцін, і звілістасць рэчышча, і саму забалочаную мясціну.

КРЫВАЯ, рака ў Горацкім раёне, левы прыток р. Проня. КРЫВОЕ, возера ў Бабруйскім раёне, старык р. Бярэзіна Назвы-характарыстыкі рэчышча і формы азёрнай катлавіны. Але не выключаем і варыянт сувязі з этнонімам крывічы.

КУЛАЖАНКА, рака ў Горацкім раёне, правы прыток р. Пална. Рускія геаграфічныя тэрміны КУЛАГА, КАЛУГА, КАЛЮГА – ‘балота’, беларускі геаграфічны тэрмін КУЛАЖЫНА – ‘нізіннае, макраватае, тарфяністае месца’. Балгарскае дыялектнае КУЛАК ‘катлавіна, яр, лагчына’. На Рускай Поўначы КУЛІГА ‘выгін ракі, круты паварот, мыс, заліў’, у цэнтральных абласцях Расіі КУЛІЖКА – ‘луг на беразе ракі, або возера’. Настратычнае КУЛ- – ‘возера’; КЛ- ‘балотнае возера, балотны паток, струмень’, эстонскае KUULJA, фінскае KULJU – ‘лужа’ [37; 13], цюркскае КУЛЬ – ‘возера’, нямецкае GUL – ‘вадаём, лужына’ [1, с. 102]. Назва ў значэнні ‘рака ў забалочанай тарфяністай лагчыне з вытокам з лужыны, возера, балота’.

КУЛЬШЫЦКАЕ возера ў Слаўгарадскім раёне, басейна р. Сож, каля в. Кульшычы. Выцякае р. Хоцінка. Назва водна-балотнай семантыкі (корань КУЛ) – у значэнні ‘забалочаная рака з вытокам з лужыны, возера, балота’, ‘забалочанае возера з ракой, ручаём’.

КУРАКОЎКА, рака ў Краснапольскім раёне, левы прыток р. Палуж. Эстонскае KURU – ‘рачная затока, вузкі праток ракі, завадзь’ [28], фінскае KURA – ‘грязь, золь’ [14]. Гідронім звязаны з забалочаннай мясцовасцю.

КУРМАНАВА, вадасховішча ў Мсціслаўскім раёне, на р. Рамясцвянка. Этымалогія зразумелая – ад назвы в. Курманава.

Літаратура: 1.Аўчыннікава, Р. І. Гідронімы Браслаўшчыны: Слоўнік. /Раіса Аўчыннікава. – Мінск: Выд. В. Хурсік, 2015. – 120 с. 2. Афанасьев, А.П. Тононимия Республики Коми. Словарь-справочник. – Сыктывкар: Коми книжное изд-во, 1996. 3. Бася //Славянская Энциклопедия. Киевская Русь-Московия.: в 2 тт. – М.: Олма-Пресс, 2002. – С. 212. 4. Бычков, А. Происхождение славян. – М.: Олимп: Аст: Астрель., 2007. 5. Ванагас, А. П. Проблема древнейших балто-славянских языковых отношений в свете балтийских гидронимических лексем / А. П. Ванагас. – Вильнюс, 1983. – 31 с. 6. Георгиев, В. Исследования по сравнительно-историческому языкознанию: Монография. – М.: Издательство иностранной литературы, 1958. – 318 с. 7. Жучкевич В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии. – Мн.: БГУ, 1974. – 448 с 8. Иловайский, Д.И. Начало Руси / Дмитрий Иловайский. – М.: Астрель: АСТ, 2006. – 629 с. 9. Инжеватов И.К. Топонимический словарь Мордовской АССР. – 2-е изд. – Саранск, 1987. 10. Ісаенка У.Ф. Гідраніміка //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 2. Веліцк – Гімн /Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал.рэд.) і інш.; Маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 1994. – С. 527–529. 11. Кисловской С. В. Знаете ли вы? Словарь географических названий Ленинградской области. – Л.: Лениздат, 1974. –184с. 12. Лемцюгова, В.П. Тапонімы распавядаюць: навукова-папулярныя эцюды / В.П. Лемцюгова. – Мінск: Литература и искусство, 2008. 13. Манаков А. Г. Неславянская топонимия северо-западных районов Псковской области / А.Г. Манаков, С. В. Ветров //Псковский регионологический журнал. – 2008. – № 6. 14. Манаков, А.Г. Этногенез славян по данным топонимии (историко-географическое исследование) /А. Г. Манаков. – Псков: ЛОГОС, 2007. – 256 с. 15. Мокиенко В. М. Об одной псковско-западнославянско-литовской изоглоссе // Вопросы теории и истории языка. – Л.: ЛГУ, 1969. – С. 273–279. 16. Мурзаев Э. М. Очерки топонимики / Институт географии АН СССР. – М.: Мысль, 1974. – 384 с. 17. Мурзаев Э.М. Словарь народных географических терминов. – М.: Мысль, 1984. –

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

656 с. 18. Невская, Л.Г. Балтийская географическая терминология (к семантической типологии) / Л.Г. Невская. – М.: Наука 1977. – 226 с. 19. Откупщиков Ю. В. Βορυσθένης и Березина Откупщиков Ю. В. //Из истории индоевропейского словообразования. – СПб.: СПбГУ, 2005. – С. 336–352. 20. Памяць: Касцюк. р-н: Гіст. дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 2000. – С. 420.21. Петров В. Этногенез славян – К., 1972. 22. Поспелов Е. М. Географические названия мира: Топонимический словарь / Ред. Р. А. Агеева. – 2-е изд. – М.: Русские словари, 2002. – 512 с. Поспелов Е. Туристу о географических названиях. – М., 1988. 24. Пьянов, В.И. Древности славян. – Минск: МФЦП, 2005. 25. Рогалев, А. Ф. Гидронимия Беларуси / А. Ф. Рогалев. – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 1999. – 408 с. 26. Рогалеў А. Ф. Назвы Бацькаўшчыны (тапанімія Беларусі). – Гомель: Барк, 2008. – 216 с. 27. Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча: у 5 т. / пад рэд. Ю.Ф. Мацкевіча/ АН БССР. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – Т. 1 (А-Г). – 512 с. 28. Смолицкая Г.П. Занимательная топонимика: Рассказы о географических названиях. – М.: Армада-пресс, 2001. – 256 с. 29. Смолицкая Г.П. Топонимический словарь Центральной России: Географические названия. – М.: Армада-пресс, 2002. 30. Студенцов, А.Ф. Тайна происхождения Древней Руси. – Москва: Феникс, 2006. – 288 с. 31. Топоров В.Н. «Baltica» Подмосковья//Балто-славянский сборник. М., 1972. С. 217–280. 32. Топоров, В. Н. Лингвистический анализ гидронимов Верхнего Поднепровья / В.Н. Топоров, О. Н. Трубачев. – Москва: Изд-во АН СССР, 1962. 33. Трубачёв О. Н. «Старая Скифия» Геродота и славяне. Лингвистический аспект // Вопросы языкознания. – 1979. – № 4. 34. Файнбарк С. А. Происхождение названий рек и озер бассейнов Верхневолжья и Верхней Меты. – DNA, 2015. – 589 с. 36. Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка: в 4- т.: Т.1. А-Д. -М.: Прогресс, 1986. – 576 с. ; Т. 2. Е-Муж. – М.: Прогресс, 1986. – 672 с; Т. 3. Муза-Сят. – М.: Прогресс, 1987. – 832 с; Т. 4. Т-Ящур. – М.: Прогресс, 1987. – 864 с. 36. Шадыро В. И., Овчинникова Р. И. О финно-угорском субстрате на севере Белоруссии (гидронимия и археология) // Археология и история Пскова и Псковской земли / Под ред. В. В. Седова. – Псков, 1992. – С. 60–62. 37. Шаруха І., Шаруха Т. Гідранімія Магілёўшчыны //Магілёўскі Мерыдыян.– 2001.–Т. 1.– Вып. 2. 38. Шаруха, І. М. Асаблівасці тапанімічнага поля міжрэчча Друці і Бярэзіны: у межах Магілёўскай вобласці // Жылічы на гісторыка-культурнай карце Беларусі: матэрыялы Рэспубліканскага навукова-практычнага семінара / Уклад. Гаранін С. Л.; Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даслед. Бел. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2017. – С. – 73–78. 39. Шаруха, І.М. Асаблівасці полацкай тапаніміі (на прыкладзе гідраніміі) / І.М. Шаруха // Полацкія чытанні – 2017: зб. матэрыялаў навукова-практычнай канферэнцыі (г. Полацк, 2 верасня 2017 года) / Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даслед. Бел. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2017. – С. 187–193. 40. Шаруха, І.М. Край у цэнтры Еўропы: Полацкая гідранімія : Этымалагічны слоўнік / Ігар Шаруха; пад рэд. І.М. Шарухі, Т. М. Шаршнёвай. – Мінск: Колорград, 2018. – 80 с. 41. Шаруха, І. М. Гідранімія наваколляў Магілёва // І.М. Шаруха. Проблемы устойчивого развития регионов Республики Беларусь и сопредельных стран : сб. материалов VIII Междун. научно-практ. Интернет-конференции, 1 марта–31 марта 2019 г., МГУ им. А. Кулешова, г. Могилев. – Могилев : МГУ им. А. Кулешова, 2019. 42. Шарухо, И.Н. Особенности гидронимии края в центре Европы / И.Н. Шарухо // Вестн. Приамурск. Гос. университета им. Шолом-Алейхема. – 2017. – № 3(28). – С. 119–132. 43. Яшкін, І.Я. Слоўнік беларускіх мясцовых геаграфічных тэрмінаў. Тапаграфія. Гідралогія / І.Я. Яшкін. – Мінск: Бел. Навука, 2005. – 808 с.

Артыкул паступіў у рэдакцыю часопіса 10 студзеня 2019 г.
Рэцэнзенты – А.Я. Яротаў, канд.геаграфічных навук, дацэнт БДУ (г. Мінск, Беларусь), С. М. Лясовіч, канд.філалагічных навук, дацэнт ПДУ (г. Полацк, Беларусь)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова